Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 195 (5028) ВЕРАСНЯ 2 НЯДЗЕЛЯ 1934 г. ГОД выдання XVIII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

МІЖНАРОДНЫ ЮНАЦКІ ДЗЕНЬ ЗА РУБЯЖОМ

ІСПАНІЯ

ПАРЫЖ, 1 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, у сувязі з міжнародным юнацкім днём комсамол Іспаніі арганізаваў у радзе буйных гарадоў—Мадрыдзе, Більбао, Севільі, Овіеда, Валенсіі і Барселоне—дэманстрацыі супроць фашызма і імперыялістычнай вайны. З мэтай прадухілення гэтых дэманстрацый ва многіх цэнтрах быў створан адзіны фронт з социялістычнай моладдзю. Урад забараніў дэманстрацыю.

ВЕНГРЫЯ

ВЕНА, 1 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Будапешта, у сувязі з намечанымі ў Міжнародны юнацкі дзень дэманстрацыямі, а таксама рыхтуючымися арыштамі комсамольцаў у Будапешце, венгерская паліцыя прыведзена ў баявую гатоўнасць.

ЧЭХА-СЛАВАКІЯ

ПРАГА, 1 верасня. (БЕЛТА). Наперакор паліцэйскай забароне ў Празе адбыліся па поваду XX Міжнароднага юнацкага дня дэманстрацыі рабочай моладзі. У ноч на 1 верасня на некаторых вежах і фабрычных трубах былі вывешаны чырвоныя сцягі.

Учора ўвечары некалькі сот маладых рабочых наладзілі дэманстрацыі па вуліцах рабочага раёна Жыжкоў, агалашаючы лозунгі супроць імперыялістычнай вайны і ў абарону СССР. 10 маладых рабочых, арыштаваных паліцыяй, аднак затым былі вызвалены дэманстрантамі.

На ўзровень павышаных задач

Яшчэ на XVI з'ездзе ВКП(б) т. СТАЛІН, характарызуючы сутнасць большэвіцкага наступлення ў перыяд рэканструкцыі, указаў на неабходнасць:

«Арганізаваць перабудову ўсёй практычнай работы профсаюзных, кааператыўных, совецкіх і ўсіх іншых масавых арганізацый прыстасоўна да патрабаванняў рэканструктыўнага перыяда; стварыць у іх ядро з найбольш актыўных і рэволюцыйных работнікаў, устраніўшы і ізаляваўшы апартуністычныя трэд'юніяніцкія бюракратычныя элементы; выгнаць вон з іх чужыя і перарадзіўшыеся элементы і вылучыць новых работнікаў знізу...».

Кіруючыся гэтымі ўказаннямі, партыя правяла карэнную перабудову работы масавых арганізацый, і XVII партыйны з'езд у сваім рашэнні запісаў:

«АРГАНІЗАВАЦЬ МАСАВЫ КАНТРОЛЬ РАБОТЫ ОРГАНАЎ КІРАЎНІЦТВА І ПАСТАВІЦЬ ПАД ЖОРСТКУЮ КРЫТЫКУ МАС БЮРАКРАТЫЧНЫЯ ЯЗВЫ І НЕДАХОПЫ АПАРАТА...

ПЕРАДАЦЬ ПРОФСАЮЗАМ УСЕ ПРАВЫ НІЗАВЫХ ОРГАНАЎ РСІ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ І КІРАЎНІЦТВА КАНТРОЛЬНЫМІ ОРГАНАМІ ПРЫ ОРС'ах, ЗРК, РАЙПО, ГАРПО».

Гэта рашэнне выходзіць з таго, што «У НЕПАСРЭДНАЙ, ЖЫРОЙ СУВЯЗІ З РАБОЧЫМІ І ВЫВУЧЭННІ ІХ ПАТРЭБ, ЗАПРОСАЎ — СІЛА ПРОФСАЮЗА І ЯГО ПЕРАВАГІ» (КАГАНОВІЧ).

Такім чынам перад профсаюзнымі арганізацыямі пастаўлены новыя, павышаныя задачы, патрабуючыя асаблівай адказнасці за работу кожнага профсаюзнага работніка, асаблівай аператыўнасці і чуласці.

У святле гэтых задач нельга не адзначыць адставанне профсаюзных арганізацый Беларусі на радзе ўчасткаў работы.

Праўда, ёсць і некаторыя дасягненні. Праведзена вялікая работа па ўзняццю працоўнай дысцыпліны, разгортванню социялістычнага спаборніцтва, арганізацыі тэхнічнай вучобы. У гэтым годзе тэхнічнай вучобай ахоплена па 19 тыс. чалавек больш, чым у мінулым. Гэтыя дасягненні бясспрэчны.

Аднак, няма яшчэ дастатковай аператыўнасці ў барацьбе за працоўную дысцыпліну, у барацьбе з класава-чужымі элементамі, якія прабуюць раскрадваць социялістычную маемасць, абважваць і ашукваць працоўных.

Перад профсаюзамі пастаўлена задача кіраўніцтва групамі масавага рабочага кантролю, і тут мы маем яшчэ значныя прарывы.

На радзе прадпрыемстваў мы назіраем выпадкі парушэння прынцыпаў масавага рабочага кантролю, калі брыгады выбіраюцца на агульных сходах замест уцягнення ў групы па добраахвотнасці. Недастаткова пастаўлена кіраўніцтва гэтымі групамі з боку фабрычна-заводскіх камітэтаў. ЦСПСБ адзначыў адсутнасць кіраўніцтва брыгадамі на такіх буйных прадпрыемствах, як завод імя Домбаля, картонная фабрыка і т. д. Гэта толькі па барысаўскай профсаюзнай арганізацыі. Але і ў радзе другіх арганізацый не лепш.

Недастаткова ўключыліся профсаюзныя арганізацыі ў барацьбу за арганізаваную сустрэчу зімы. Да гэтага часу кіраўніцтва гэтай работай у большасці сваёй ляжыць на дырэктарах і сакратарах парткомаў прадпрыемстваў. «Звязда» пісала ўжо аб бяздушных адносінах асобных профсаюзных арганізацый да запросаў рабочых, аб няўвазе да самых надзенных патрабаванняў працоўных. Хіба не забыццём інтарэсаў працоўных можна тлумачыць становішча з рабочымі кватэрамі на фабрыцы «Герой працы»—Добруш, шклозаводзе імя Сталіна, заводзе імя Дзімітрава—Магілеў і т. д. Такіх фактаў, на жаль, вельмі многа.

Можна прывесці рад фабзаўмясцкомаў, якія не ведаюць, колькі рабочых маюць патрэбу ў рамонце кватэр, у рамонце абутку.

Зусім адсталы ўчастак у рабоце профсаюзаў — барацьба за ўшчыльненне рабочага дня. Ушчыльніць рабочы дзень — гэта значыць узняць працоўную дысцыпліну, даць краіне на многа тысяч рублёў дадатковых тавараў, забяспечыць поўнае выкананне промфінплана. І, нарэшце, гэта значыць навучыцца культурна, па-новаму працаваць.

Зусім адсталы ўчастак — інтэрнацыянальна-выхаваўчая работа сярод членаў профсаюзаў і барацьба за беларусізацыю. У гэтай галіне профсаюзамі зроблена вельмі мала.

Партыя паставіла перад профсаюзамі вялікія задачы. І ў цэнтры ўвагі ўсіх профсаюзных арганізацый павінна быць зараз ліквідацыя гэтых недахопаў. Прычым асноўны ўпор трэба зрабіць на масавы рабочы кантроль, узмацненне кіраўніцтва брыгадамі масава-рабочага кантролю. Якасць гэтага кіраўніцтва і работа саміх груп будзе вызначаць не колькасць прынятых рашэнняў або складзеных актаў, а практычныя рэзультаты ў паляпшэнні работы сталовай, ОРС'а, выкананне ўсіх гаспадарчых задач.

Зіма. Яна патрабуе асабліва сур'ёзнай падрыхтоўкі. І за гэта ў першую чаргу павінны адказваць профсаюзныя арганізацыі. Трэба ўзняць адказнасць профсаюзных работнікаў, трэба, каб яны зразумелі, што яны ў першую чаргу адказваюць за задаваленне матэрыяльна-бытавых патрэб рабочых.

Неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на закінуты пакуль што ўчастак — культурнае абслугоўванне тарфянікаў, сплаўшчыкаў, соўгаспных рабочых. Сярод іх неабходна ўзмацніць не толькі культурную, але і выхаваўчую, інтэрнацыянальную работу.

І, нарэшце, пытанне аб кадрах. Трэба смялей вылучаць на профсаюзную работу лепшых ударнікаў, праверэных у практычнай рабоце на вытворчасці, чулых, здольных да аператыўнай работы таварышоў. Трэба пакончыць з недаацэнкай нізавой профсаюзнай работы і цякучасцю нізавых кадраў. Значная цякучасць, якая ёсць зараз, не спрыяе ўзмацненню профсаюзных арганізацый на мясцах, падрывае прынцыпы выбарнасці і профсаюзнай дэмакратыі.

Неабходна ўзмацніць увагу да профсаюзных арганізацый. Партыйныя арганізацыі павінны аказаць практычную дапамогу ў кіраўніцтве і вылучэнні лепшых комуністаў на профсаюзную работу. Толькі пры гэтых умовах профсаюзы змогуць справіцца са сваёй задачай як адзін з прыводных рамнёў ад партыі да мас.

Надыходзячая зіма, выкананне апошняй пастановы партыі і ўрада аб барацьбе з абважваннем, рэалізацыя ўказанняў партыі аб рабоце груп масавага рабочага кантролю з'явіцца БАЯВОЙ ПРАВЕРКАЙ ДЛЯ ПРОФСАЮЗАЎ ІХ ЗДОЛЬНАСЦІ ЗАРАЗ, НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, ПРЫ ПАВЫШАНЫХ ЗАДАЧАХ АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ ГЕНЕРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ.

ЗАКРЫУСЯ УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

ЗАКЛЮЧНАЕ ПАСЯДЖЕННЕ 1 ВЕРАСНЯ

Пачынаецца заключнае пасяджэнне першага Усесаюзнага з'езда совецкіх пісьменнікаў.

4 гадз. 15 мін. У прэзідыуме з'яўляюцца сакратар ЦК ВКП(б) тав. **Жданаў** і заг. аддзелам культуры і прапаганды ленінізма тав. **Стэцкі**, сустракаемыя доўгай авацыяй. За сталом прэзідыума тт. **Жданаў, Стэцкі, Юдзін, Фадзееў, Іваноў, Сейфуліна, Кулік, Андрэ Мальро, Міх. Кальцоў, Кірпоцін** і інш.

Адкрывае заключнае пасяджэнне з'езда т. Фадзееў. Агалашаецца заява т. Бухарына ў прэзідыум з'езда, у якой ён канстатуе лішнюю рэзкасць палемічных выпадаў, зробленых ім у заключным слове на адрасу сваіх апанентаў.

Калі зачытваецца гэта заява, у прэзідыуме з'езда з'яўляецца Алексей Максімавіч Горкі. Зал сустракае яго шумнай авацыяй.

Ад імя камісіі, вылучанай з'ездам для прапрацоўкі тэкста статута саюза совецкіх пісьменнікаў, слова атрымлівае т. **Зуёў**.

З'езд аднагалосна прымае статут з усімі прапанаванымі камісіяй выпраўленнямі.

Затым выходзіць на трыбуну тав. **Олеша**. Ён прапануе паслаць прывітанне Цэнтральнаму Камітэту ВКП(б).

Першыя-ж словы прывітання: Усесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў вітае баявы штаб социялістычнага будаўніцтва — Ленінскі Цэнтральны Камітэт» сустракаюцца громам апладысментаў.

— «Няхай жыве Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў! Няхай жыве наш **Сталін!**».

Авацыя ўсяго зала. З'езд доўга незмаўкаючымі апладысментамі горача вітае ЦК партыі, правадыра працоўных усяго света—таварыша **Сталіна**.

Слова для прапановы атрымлівае **т. Мікітэнка**.

Выбухам воплескаў сустракаюць делегаты прапанову паслаць прывітанне Соўнаркому СССР.

— Мы ведаем, што Совет Народных Камісараў Саюза ССР на чале з **т. Молатавым** спакойна і непахісна стаіць на варце граніц нашай вялікай краіны—граніц новага свету. Доўга не сціхаюць апладысменты.

На трыбуне **т. Тіханаў**.

— Мы патрабуем свабоды Тэльману! Мы ціснем тваю руку, наш Тэльман. Мы глыбока цэнім тваю мужнасць. Свабоду Тэльману!

З'езд зноў падымаецца, каб доўгай авацыяй выразіць бурны пратэст усёй совецкай інтэлігенцыі супроць фашысцкіх катаў, затачыўшых правадыра рабочага класа Германіі.

Пасля прыняцця звароту да рабочых папяровых фабрык, слова для пазачарговай заявы атрымлівае т. **Андрэ Мальро**.

Перш чым перакласці слова французскага пісьменніка, т. І. Эрэнбург зачытвае тэлеграму ТАСС з Токіо, у якой паведамляецца, што госць з'езда совецкіх пісьменнікаў—японскі драматург т. Хідзікато—пасля звароту на «радзіму» будзе пазбаўлен звання пэра і арыштован.

Андрэ Мальро па поваду гэтага паведамлення з Токіо заяўляе: Усе, замежныя пісьменнікі - ўдзельнікі з'езда аднагалосна прызнаюць необходным выразіць т. Хідзікато свае сімпатыі і публічна заявіць аб сваёй поўнай салідарнасці з ім.

Зал устае. У адзіным парыве ўсе делегаты, усе госці з'езда апладысментамі, пратрымаўшымі на ўвесь Дом саюзаў, прадэманстравалі сваю брацкую інтэрнацыянальную салідарнасць, выказалі свае гарачыя сімпатыі японскім рэволюцыйным пісьменнікам.

Нішто іншае, як гэтыя рэпрэсіі, не можа паказаць значэнне прамовы т. Хідзікато, значэнне нашага з'езда,—заявіў у заключэнне тав. Андрэ Мальро.

З'езд пераходзіць да выбараў кіруючых органаў Саюза совецкіх пісьменнікаў.

Ад імя делегацый маскоўскай, ленінградскай, украінскай, беларускай, закаўказскіх і сярэдне-азіяцкіх рэспублік т. **Кулік** прапануе выбрань праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР у складзе 101 чалавека.

Прапанова прымаецца аднагалосна.

Ад імя гэтых-жа делегацый т. Кулік прапануе персанальны склад членаў праўлення.

На першым месцы—Алексей Максімавіч Горкі. Зал сустракае імя вялікага пролетарскага пісьменніка бурай прывітанняў. Авацыя.

Аднагалосна з'езд выбірае праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР і рэвізійную камісію саюза ў колькасці 20 чалавек.

Старшынствуючы т. Фадзееў аб'яўляе:

Заключнае слова прадастаўляецца Алексею Максімавічу Горкаму.

Бура апладысментаў. Яны разрастаюцца, калі Алексей Максімавіч паяўляецца на трыбуне. Усе госці, сутныя ў зале, стоячы, бурна вітаюць Алексея Максімавіча. Нарэшце наступае цішыня.

Пры напружанай увазе зала гаворыць Алексей Максімавіч сваю прамову, падводзячы вынікі работы першага з'езда совецкіх пісьменнікаў. Прамова канчаецца. З глыбіні зала раздаюцца гукі «Інтэрнацыянала». Гімн пролетарыята падхватваюць усе прысутныя.

***

— Другога верасня,—паведамляе т. Фадзееў,—адбудзецца пленум праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў.

Першы ўсесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў аб'яўляю закрытым.

Чачэрск, прэзідыуму РВК

Соўнарком ставіць на від старшыні і намесніку старшыні РВК за лёгкадумныя і недысцыплінаваныя адносіны да тэлеграфнага распараджэння ЦК і СНК па выкананню плана малакопаставак і да тэлеграмы Соўнаркома падачы вестак аб выкананні вышэйпаказанай тэлеграмы ЦК і СНК. Такія недапушчальныя адносіны відаць з таго, што весткі падпісаны «Маслапромам», але не старшынёй РВК або яго намеснікам.

Напамінаю, што ваш раён ганебна адстае ў выкананні дзяржаўных заданняў па малакопастаўках.

Праз пяць дзён тэлеграфна паведаміце ў Соўнарком аб прынятых вамі мерах.

Старшыня Соўнаркома БССР М. ГАЛАДЗЕД.

СВЯТКАВАННЕ XX МІЖНАРОДНАГА ЮНАЦКАГА ДНЯ У МЕНСКУ

ПАРАД КВІТНЕЮЧАЙ МАЛАДОСЦІ

Пад цёплымі праменнямі верасневскага сонца, пад лёгкі шэлест пяшчотнага ветра яркай чырванню квітнела сталіца, поўнілася вясёлым гулам людскога прыбою, гучнымі песнямі, пераможным маршам аркестраў.

Учора ўся сталіца выйшла на вуліцы і плошчы. З раніцы пачаў збірацца пролетарскі маладняк на Ляхаўцы, Камароўцы, Старажоўцы, Кальварыі, у шматлікіх заводах і фабрыках, каля навучальных устаноў.

Стройнымі радамі рухаліся калоны першага маршрута.

Радасна, весела крочылі юныя піонеры, высока трымаючы ў руках букеты кветак. Загарэлыя, пранізаныя дыханнем гарачых праменняў, свежасцю лясоў і вады, нядаўна вярнуўшыся з лагераў, яны дэманстравалі сваю бадзёрасць, вытрымку, энтузіязм маладых будаўнікоў социялізма.

Цвёрдым поступам рухаліся значкісты ГПА, варашылаўскія стралкі, «выдатнікі»-зотаўцы заводаў «Большэвік», імя Варашылава, «Комунаркі».

Цвёрдай хадою маршыравалі фізкультурнікі промкааперацыі.

У загарэлых руках абутнікаў, друкароў, металістаў на празрыстай матэрыі партрэты любімага правадыра нашай партыі тав. Сталіна.

Учора шматлікія калоны маладых ударнікаў социялізма дэманстравалі свае велізарныя дасягненні, якіх яны дабіліся каля фрэзерных станкоў і такарных варштатаў, каля швэйных машын. Яны аўладалі перадавой тэхнікай у асваенні новых складаных машын.

***

Плян Волі ўпрыгожан плакатамі, лозунгамі, партрэтамі правадыроў. Усё гэта гаворыць аб тым, што моладзь Менска нядрэнна рыхтавалася да святкавання XX Міжнароднага юнацкага дня.

1 ВЕРАСНЯ НА ПЛЯЦЫ ВОЛІ.
Сакратар ЦК КП(б)Б тав. ВАЛКОВІЧ, сакратар Менгаркома КП(б)Б тав. РЫСКІН, члены Бюро ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ўрада вітаюць з трыбуны праходзячыя калоны дэманстрантаў.

У 1 гадзіну 30 мінут дня на плошчу прыходзіць каманда ў белых спартыўных касцюмах і займае месца лінейных. У далечыні вуліц, акружаючы плошчу, чуюцца гукі аркестраў. За Домам працы калоны рабочай моладзі спыняюцца, займаюць чакальную «пазіцыю». Маладзь зотавец на гармоніку грае «яблычка», дзяўчаты танцуюць.

Стрэлка гадзінніка паказала без дзесяці два. На трыбуну ўзыходзіць сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Валковіч**, сакратар ЦК ЛКСМБ тав. **Стукалаў**, сакратар Менскага гарадскога камітэта партыі тав. **Рыскін** і тт. **Закоўскі, Картукоў, Кудзелька, Хадасевіч, Бенек** і іншыя.

Пачынаецца парад. Першымі праходзяць маладыя лётчыкі, лётчыцы, якія працуюць ля варштатаў і адначасова вывучаюць тэхніку лётнай справы.

— Няхай жывуць маладыя лётчыкі!—вітае іх сакратар ЦК тав. **Валковіч**. Моцнае «ура» пакрывае плошчу. Яго падхватваюць узброеныя варашылаўскія стралкі.

Рабочая моладзь менскага завода імя Варашылава, па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі, абавязалася ператварыць свой завод у моцную крэпасць абароны краіны. Яна сёння паказвала свае поспехі ў гэтай справе. Перад трыбунай праходзяць дзве трузавыя аўтамашыны, на якіх размешчан атрад рабочых. За імі праходзіць каманда разведчыкаў, пасаджаная на веласіпеды. У калоне варашылаўцаў бадзёра маршыруе стары рабочы, галава якога ўпрыгожана срэбрам сівізны. Ён па-дзіцячаму ўхмыляецца, ён радуецца тым дасягненням, якіх дабілася наша моладзь на фронце социялістычнага будаўніцтва. Дзед ганарыцца тым, што побач з ім ідуць яго дзве дачкі—работніцы— і маленькі ўнучак-піонер. У радах варашылаўцаў ішло тры пакаленні.

Рабочая моладзь завода «Комунар» паказвала партыі і ўраду маделі варштатаў, асвоеных у 1934 г. Кожны завод, арганізацыя паказвалі нашай партыі і ўраду тыя дасягненні, з якімі моладзь прышла да вялікага свята.

Перад трыбунай на добрых конях праязджаюць калгаснікі, калгаснікі, рабочыя і работніцы соўгасаў Менскага раёна. На вазах яны пабудавалі выстаўку ўраджайнасці сваіх палёў. Жыта, ячмень, авёс, пшаніца, буракі, капуста—вось што вялікі прадстаўнікі новай вёскі.

Апошнімі перад трыбунай праходзяць фізкультурнікі і фізкультурніцы. Удзельнічала ў парадзе звыш 10 тыс. чалавек.

АБ РАБОЦЕ ПАРТГРУП У ЖЫВЕЛАГАДОЎЧЫХ ФЕРМАХ ПА КАЛГАСАХ „КОМІНТЭРН", ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЕНА, І „КОМІНТЭРН", МАГІЛЕЎСКАГА РАЕНА

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Азнаёміўшыся з работай партгруп калгасаў «Комінтэрн», Дзяржынскага раёна, і «Комінтэрн», Магілеўскага раёна, а таксама заслухаўшы парторгаў гэтых груп тт. Васілец і Топалева, ЦК адзначае, што партгрупа калгаса «Комінтэрн», Магілеўскага раёна, не ўсвоіла пастаноў пленума ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб паляпшэнні і развіцці жывёлагадоўлі і не прапрацавала іх у масе калгаснікаў.

У сваёй рабоце партгрупа і парторг т. Топалеў не перабудаваліся па-новаму — кіраваць канкрэтна і аператыўна і не выходзілі з указанняў пленума ЦК ВКП(б) аб тым, што «арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаванне існуючых калгасных таварных ферм і стварэнне фермы ў кожным калгасе павінна стаць першачарговай задачай партыйных і совецкіх арганізацый».

ЦК лічыць, што гэта іменна і з'яўляецца галоўнай прычынай недавальняючай работы жывёлагадоўчай і свінагадоўчай ферм калгаса: а) прадаўжаецца значны адыход маладняка (16,2 проц. цялят і 42 проц. парасят); б) у свінарніках, на скотных дворах бруд, вшывасць усяго свінога пагалоўя; в) у доглядзе жывёлы на фермах панае абязлічка; г) у аплаце працы ўраўнілаўка — адсутнічае эдзельшчына і як вынік усяго гэтага — недабор малочнай і мясной прадукцыі (заместь намечанага ўдою малака ў 66.560 літраў, сабрана толькі 39.253 літры, замест запрактаваных па плану 287 галоў свіней, захавана 157 галоў).

У рэзультаце калгас, маючы ўсе магчымасці быць па здачы дзяржаве сваёй прадукцыі ў ліку першых, аказаўся ззаду, выканаўшы па здачы малака толькі 42,4 проц. плана.

Загадчык свінагадоўчай фермы комуніст Кавалёў недастаткова змагаўся з усімі ўказанымі недахопамі на ферме і не стараўся ўвайсці ва ўсе бакі работы на ёй. Тав. Кавалёў дрэнна ведаў, што даюць у корм свінапагалоўю і ў якой колькасці, у рэзультаце прагледзеў перарасход і разбазарванне на ферме кармоў. Кавалёў дрэнна ведаў, як пабудован і праводзіцца ўлік вырошчваемага маладняка на ферме, у рэзультаце прагледзеў высокі адыход і разбазарванне парасят. Праўленне калгаса «Комінтэрн» і старшыня т. Гізельс замест сапраўднага аператыўнага кіраўніцтва і дапамогі фермам абмяжоўваліся частай зменай загадчыкаў (за год 4 загадчыкі), зацягнулі пабудову кароўніка, цялятніка і свінарніка, не займаліся як спед пытаннем кармовай базы, у прыватнасці, не засілаавалі ні адной тоны сіласу.

Магілеўскі райком партыі таксама прагледзеў зусім нездавальняючы стан справы жывёлагадоўлі ў калгасе «Комінтэрн», не гледзячы на тое, што калгас «Комінтэрн» і яго фермы з'яўляюцца аднымі з буйнейшых у раёне, і ў гэтым калгасе і на ферме не раз бывалі інструктар гаркома т. Гарбуноў і пасылаўся для абследвання зоатэхнік райза т. Кандуктарава.

Выходзячы з гэтага, бюро ЦК абавязвае партгрупу і праўленне калгаса «Комінтэрн» так паставіць у далейшым сваю работу, каб забяспечыць у першую чаргу добрую зімоўку жывёлы. У асаблівасці неабходна: а) да 15 кастрычніка г. г. скончыць пачатае будаўніцтва кароўніка і свінарніка, б) правесці неабходны рамонт наяўных скотных памяшканняў, іх ацяпленне і дэзінфекцыю. Абавязаць магілеўскі РВК аказаць калгасу «Комінтэрн» у гэтым неабходную дапамогу; в) загатовіць дастатковую колькасць кармоў, у тым ліку засілаваць намечаныя па плану 400 тон сілосу.

Неабходна ўвесці поўны рацыён кармлення для дарослай жывёлы і маладняка, устанавіўшы строгі ўлік выдаткавання кармоў.

Рашуча пакончыць з брудам у памяшканнях скотных двароў і свінарніках. Ачысціць жывёлу ад вшывасці. Такую-ж работу правесці ў кожнай канюшні з кожным канём.

Знішчыць абязлічку ў доглядзе жывёлы і ўраўнілаўку ў аплаце працы на абодвух фермах, устанавіўшы налічэнне працадзён калгаснікам жывёлагадоўчых брыгад на аснове эдзельшчыны па колькасці абслугоўваемай жывёлы, вырошчваемага прыплоду і выхаду прадукцыі.

Неабходна таксама ўстанавіць прэміраванне за перавыкананне плана і добрую якасць работы і ўтрыманне за падзеж маладняка, ляпавасць матак і нізкую якасць прадукцыі — у размерах, указаных пастановай пленума ЦК ВКП(б).

Абавязаць нам. начальніка магілеўскага райза тав. Янчэўскага зрабіць у гэтых адносінах усе неабходныя практычныя ўказанні і дапамагчы калгасу «Комінтэрн».

ЦК абавязвае партгрупу і праўленне калгаса забяспечыць поўнае выкананне плана здачы дзяржаве малака і мяса за трэці квартал і нядоімкі за другі.

ЦК лічыць, што для правядзення ў жыццё ўсіх указаных мерапрыемстваў калгас «Комінтэрн» мае ўсе магчымасці, трэба толькі партыйнай арганізацыі па-большэвіцку выконваць указанні партыі. Прыкладам гэтаму можа служыць другі заслуханы калгас «Комінтэрн», Дзяржынскага раёна. Не гледзячы на рад усё яшчэ маючыхся сур'ёзных недахопаў у рабоце фермы, партгрупа гэтага калгаса адолела на аснове ўказанняў XVII з'езда партыі і пастановы пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б практычна дабіцца правядзення на свінаферме свайго калгаса асноўных указанняў партыі па развіццю жывёлагадоўлі, а іменна: ўвядзення эдзельшчыны, замацавання пастаянных работнікаў за пэўнай работай на ферме, увядзення заахвочвання за перавыкананне плана і добрую работу, а таксама устанаўлення матэрыяльнай адказнасці за дрэнную работу і інш. і ў рэзультаце — дабіцца прыкметнага скарачэння адыходу і павышэння таварнасці фермы.

ЦК зварачае ўвагу партгруп абодвух калгасаў і комсамольскіх арганізацый, што пастанова пленуму ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб жывёлагадоўлі павінна стаць эдабыткам беспартыйнага актыва і шырокіх калгасных мас.

На аснове разгортвання социялістычнага спаборніцтва, неабходна ўцягваць у справу барацьбы за развіццё жывёлагадоўлі, за пароднасць жывёлы кожнага калгасніка. Трэба дабіцца, каб кожны калгаснік і адпасобнік сапраўды ведалі аб інфотах, правуглядженых законам за вырошчванне цёлы, або каровы і продажы іх на ферму.

Партгрупы павінны паставіць, як адну з сур'ёзнейшых задач сваёй работы — хутчэйшае асваенне тэхнікі жывёлагадоўлі ўсімі работнікамі ферм. Неабходна арганізаваць зааветгурткі з тым, каб ужо ў зімовы перыяд работнікі ферм аўладэлі зааветмінімумам ведаў.

ЦК абавязвае магілеўскі і дзяржынскі райкомы праверыць выкананне на справе ўказанняў пленума ЦК ВКП(б) аб забароне перакідкі заг. фермамі на другія работы без дазволу райза і ўстанаўленне праяжнасці работы калгаснікаў у жывёлагадоўчай брыгадзе не менш двух год.

Абавязаць партгрупы калгасаў «Комінтэрн» — Магілеўскага і Дзяржынскага раёнаў прапрацаваць даную пастанову сярод калгаснікаў ва ўсіх брыгадах.

Дадатковыя кармовыя рэсурсы для жывёлагадоўлі

Пастанова Народнага Камісарыята Земляробства БССР

Маючы на ўвазе, што вапнаванне саломы павялічвае ў 2-3 разы спажыўнасць яе, што можа даць ва ўмовах БССР значныя кармовыя рэсурсы для жывёлагадоўлі, Наркамзем БССР пастанаўляе:

Правесці ў бягучым годзе вапнаванне саломы ў першую чаргу ў наступных раёнах: Горацкім, Мсціслаўскім, Аршанскім, Бешанковіцкім, Дубровенскім, Клімавіцкім, Крычаўскім, Касцюковіцкім, Лепельскім, Полацкім, Чашніцкім, Дзяржынскім, Смалявіцкім, Лагойскім, Плешчаніцкім, Бягомльскім, Бабруйскім, Бярэзінскім, Чэрыкаўскім, Чачэрскім, Прапойскім, Веткаўскім.

Абавязаць дырэктароў: Менскага навукова-даследчага інстытута свінагадоўлі, Горацкай зональнай станцыі буйнай рагатай жывёлы і Турскай даследчай станцыі кармовых культур, пад іх асабістую адказнасць, паставіць пробнае вапнаванне і кармленне жывёлы саломай (азімай і яравой) з 5 па 25 верасня г. г. і на аснове гэтага з 25 верасня па 1 кастрычніка г. г. правесці ў гаспадарках памянёных даследчых устаноў пазазональныя пяцідзённыя курсы-канферэнцыі.

Курсы правесці на непасрэднай рабоце па вапнаванню саломы і кармленню ёю жывёлы.

Абавязаць загадчыкаў райза вышэйназваных раёнаў камандыраваць на курсы-канферэнцыі па адному раённаму зоатэхніку, згодна ніжэйпрыведзенага спіса з тым, каб камандыраваныя зоатэхнікі, аўладаўшы тэхнікай вапнавання саломы, арганізавалі практычна работу па вапнаванню і скармліванню саломы жывёле ў сваіх раёнах.

У Горацкую зональную станцыю буйнай рагатай жывёлы накіраваць зоатэхнікаў наступных раёнаў: Горацкага, Мсціслаўскага, Аршанскага, Бешанковіцкага, Дубровенскага, Клімавіцкага, Крычаўскага, Касцюковіцкага, Лепельскага, Полацкага, Чашніцкага.

У Менскі даследчы інстытут свінагадоўлі накіраваць зоатэхнікаў наступных раёнаў: Дзяржынскага, Смалявіцкага, Лагойскага, Плешчаніцкага, Бягомльскага, Бярэзінскага, Слуцкага, Капыльскага.

У Турскую даследчую станцыю кармовых культур накіраваць зоатэхнікаў наступных раёнаў: Бабруйскага, Быхаўскага, Чэрыкаўскага, Чачэрскага, Прапойскага, Веткаўскага.

Для правядзення курсаў-канферэнцый па вапнаванню саломы ў названых даследчых установах адпусціць 5.000 руб.

Абавязаць загадчыкаў райза вышэйпамянёных раёнаў неадкладна выпучыць калгасы, у якіх будзе праводзіцца вапнаванне саломы, заранжа звязацца з заводамі па перапрацоўцы вапны і загатовіць вапну з разліку 7-8 кгр. нягашанай вапны добрай якасці, або цеста гашанай вапны 20-22 кгр. на 100 кгр. саломенай рэзкі; падрыхтаваць матэрыялы для пабудовы яшчыкаў для вапнавання саломы і ў перыяд паміж 5-20 кастрычніка г. г. правесці курсы-канферэнцыі па вапнаванню саломы для загадчыкаў ферм калгасаў, дзе камячаецца вапнаванне саломы, пад кіраўніцтвам зоатэхнікаў, былых на курсах, з тым, каб у парадку жывога вопыта перадаць тэхніку вапнавання саломы і яе скармліванні непасрэдна ў калгасы.

Наркамзем БССР, падкрэсліваючы ўсю важнасць і значэнне вапнавання саломы, адначасова папярэджвае, што сярэдне вапнавання саломы, як новага, патрабуе ўважлівых і сур'ёзных да яе адносін, і прапануе загадчыкам райза ўзяць вапнаванне саломы пад свой непасрэдны кантроль і кіраўніцтва, асабліва звяртаючы увагу на аўладанне тэхнікай гэтай справы і дакладнае яе прымяненне.

Народны Камісар Земляробства БССР ГЕНЕК.

ПАД СЦЯГАМ СОВЕТАУ, ПАД СЦЯГАМ СОЦЫЯЛІЗМА

Прамова загадчыка аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК ВКП(б) т. СТЭЦКАГА

З'ЕЗД—ВЯЛІКАЯ ПАДЗЕЯ У НАШАЙ ЛІТАРАТУРЫ

З'езд совецкіх пісьменнікаў праходзіць з выключным поспехам і акружан вялікай увагай нашай краіны.

Яшчэ некалькі месяцаў таму назад знаходзіліся людзі, якія сумняваліся, ці трэба наогул збіраць гэты незвычайны з'езд, ці выйдзе з яго што-небудзь. Нават напярэдадні з'езда былі такія размовы.

Але вось з'езд адкрыўся. З'езд рушыўся. Ён узяў велізарны разбег. Зараз мы ўжо знаходзімся на 13 дні гэтага з'езда, а між тым ні наш паважаны старшыня, ні флегматычны член прэзідыума т. Дзем'ян Бедны, ні рупны Барыс Пастэрнак — ніхто не ведае, як зараз спыніць гэты з'езд, — такую безліч творчых пытанняў ён падняў, такую творчую энергію ён развіў у сваім ходзе.

З'езд, несумненна, з'явіцца і з'яўляецца ўжо зараз велізарнай падзеяй у нашай літаратуры. Усе адчуваюць, пісьменнікі асабліва, што пасля з'езда літаратура стане іншай, яна падымецца на новую ступень. І будучы гісторык літаратуры, зразумела, будзе весці літаратурнае летазлічэнне ад і да першага з'езда совецкіх пісьменнікаў. **(Апладысменты).**

Таварышы! На гэтым з'ездзе пісьменнікі ўсіх народаў Совецкага Саюза. Тут сабраліся прадстаўнікі самай кваліфікаванай інтэлігенцыі народаў Совецкага Саюза.

Яны прышлі сюды, на з'езд, з усімі пытаннямі, якія іх хвалююць. На самым з'ездзе — і ў дакладзе Алексея Максімавіча, і ў дакладах прадстаўнікоў паасобных рэспублік Саюза ССР быў выпукла прадстаўлен увесь той багацейшы вопыт, уся тая культурная спадчына, якая ёсць у нашых рэспубліках. З'езд наочна паказаў, што ў нашай брацкай сям'і жывуць народы, якія стагоддзямі і тысячагоддзямі вылічаюць сваю культуру. Мы выйдзем, несумненна, узбагачаныя з гэтага з'езда.

Ужо да з'езда была праведзена вялікая работа па азнаямленню з літаратурай народаў Совецкага Саюза. Але з таго, што мы пачулі на з'ездзе, можна сказаць, што мы знаходзімся толькі ў пачатку гэтай вялікай работы па азнаямленню і збліжэнню пісьменнікаў народаў Совецкага Саюза аднаго з другім, па азнаямленню пісьменнікаў з усёй той рознастайнай, багатай культурай народаў Совецкай краіны, шырокае і выразнае ўяўленне аб якой дае першы з'езд совецкіх пісьменнікаў.

Тут выступалі прадстаўнікі розных народаў Совецкага Саюза, прадстаўнікі розных літаратурных плыней. Усе яны па-свойму, на свой літаратурны лад, ставілі творчыя пытанні. Але ўсіх іх яднала адно, усе іх выступленні вярцеліся вакол таго, за што змагаецца наша краіна — вакол **справы соцыялізма.**

Мы можам з поўным правам сказаць, што гэты з'езд, на які сабраліся прадстаўнікі лепшай часткі інтэлігенцыі народаў Совецкага Саюза, паміма свайго літаратурнага значэння, мае буйнейшае **палітычнае** значэнне, бо гэты з'езд афармляе і замацоўвае ўжо даўно пачаты працэс аб'яднання **інтэлігенцыі народаў Совецкага Саюза пад сцягам Советаў, пад сцягам соцыялізма.**

НАША ЛІНІЯ—ГЭТА ЛІНІЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА РЭАЛІЗМА

На з'ездзе адбывалася жывая творчая дыскусія. Тут былі закрануты ўсе пытанні літаратурнай творчасці. У гэтым карэннае адрозненне ад тых часоў, калі літаратурны рух накіроўваўся РАПП'ам.. Вы помніце, што РАПП меў сваю «генеральную лінію», свайго «генеральнага сакратара», сваю «генеральную платформу», якую прабавалі навязаць усім пісьменнікам. Вы помніце таксама жорсткія спрэчкі, якія ішлі вакол кожнай крошкі і кожнай коскі гэтай платформы.

Зараз гэтага няма. На першым з'ездзе совецкіх пісьменнікаў адбываецца свабодная творчая дыскусія, свабоднае абмеркаванне ўсіх творчых пытанняў. На гэтым з'ездзе не выносіцца ніякіх рэзалюцый па творчых пытаннях, якія былі-б абавязковы для кожнага пісьменніка.

Калі абмяркоўвалася праграма работ з'езда і высоўваліся дакладчыкі па гэтым з'ездзе, то оргкамітэт, разумеецца, гэту праграму з'езда і дакладчыкаў узгадняў з нашай партыяй. Я думаю, што гэта ні для каго не сакрэт. Але гэта зусім не значыць, што кожны даклад з'яўляецца якімсці канонам, якойсці платформай, дзе кожная коска, кожнае слова не падлягае ніякай змене і абавязкова к няўхільнаму выкананню. Гэтага няма, таварышы. Гэта было-б сціснеццем творчай ініцыятывы.

У нас няма таксама ніякіх рашэнняў партыі і ўрада аб тым, каб даваць афіцыяльныя характарыстыкі і ацэнкі паасобным пісьменнікам, выдаваць прадзікам і паэтам свайго роду ордэны, званні выдатнасці, знакі заахвочвання або знакі ганьбавання і хулы розных ступеней. Я не ведаю таксама ніякіх рашэнняў партыі і ўрада аб «кананізацыі» Маякоўскага.

Маякоўскі — магутны паэт, паэт раволюцыі, але ў нас няма рашэнняў аб тым, каб раўнаць усю нашу совецкую паэзію толькі па Маякоўскаму. І калі т. Бухарын у сваім дакладзе даў ацэнку паасобным творам і творчасці паэтаў, то ён гэта зрабіў апоў-талі ў парадку пастаноўкі творчых пытанняў на з'ездзе. Гэта зусім не значыць, што кожны паэт на гэтым з'ездзе атрымаў ад партыі ці ўрада свой знак адрознення, з якім ён павінен з гэтага з'езда пайсці. Гэта было-б праяўленнем найвялікшага бюракратызма, а вы ведаеце, што няма больш непрымірымага барацьбіта з бюракратызмам, чым наша партыя.

У НАС ЁСЦЬ ГРАМАДСКАЯ ДУМКА, КРЫТЫКА, ЧЫТАЧЫ, ЯКІЯ ВЫРАСЛІ ЗА АПОШНІЯ ГАДЫ І ЯКІЯ САМІ ВЕЛЬМІ ДОБРА РАЗУМЕЮЦЬ, ЯКІ ТВОР КАШТОЎНЫ, ВАРТЫ ПАХВАЛЫ, А ЯКІ ТВОР ВАРТЫ ГАНЬБАВАННЯ.

Але, калі ў нас у літаратуры ідзе свабоднае творчае спаборніцтва, жывое абмеркаванне творчых пытанняў, то гэта зусім не значыць, што ў нас няма ніякай лініі ў літаратуры. Не, таварышы, у нас ёсць лінія ў літаратуры, і аб гэтым гаварылася амаль ва ўсіх выступленнях на з'ездзе. Аб гэтым гаварылася і ў дакладзе Алексея Максімавіча і ў выступленні сакратара ЦК т. Жданава. Наша лінія — гэта соцыялістычны рэалізм. **(Апладысменты).**

Вы самі сказалі ў сваёй рэзалюцыі, што вы хочаце стварыць творы, прасякнутыя духам соцыялізма. Вось лінія совецкай літаратуры. А ва ўсім астатнім — свабоднае творчае спаборніцтва.

У нас занадта многа мудруюць па поваду соцыялістычнага рэалізма.

Соцыялістычны рэалізм зусім не прадстаўляе сабой якісці набор інструментаў, які выдаецца пісьменніку для стварэння мастацкіх твораў. Некаторыя пісьменнікі патрабуюць, каб ім была дана ва ўсіх дэталях тэорыя соцыялістычнага рэалізма.

Вы — прадстаўнікі лепшай часткі інтэлігенцыі. «Каму многа дана, з таго многа і патрэбуецца». І калі гавораць, што нам трэба паказаць соцыялістычны рэалізм, то тут, на з'ездзе пісьменнікаў, адказ можа быць толькі адзін: соцыялістычны рэалізм можа быць лепш за ўсё паказан у тых мастацкіх творах, якія ствараюць совецкія пісьменнікі.

СОВЕЦКІЯ ПІСЬМЕННІКІ АКРУЖАНЫ ЛЮБОЮЮ І КЛОПАТАМІ ПРАЦОЎНЫХ

Характэрнай рысай з'езда совецкіх пісьменнікаў з'яўляецца тая напружаная ўвага, якой яго акружыла ўся наша краіна. Нямала гаварылася аб тым, што ў краіне Советаў зніклі перагародкі, якія ў мінулым аддзялялі мастака ад народу. Але я думаю, што многія з пісьменнікаў па ўсёй сіле ўпершыню адчулі гэта тут, на з'ездзе совецкіх пісьменнікаў. Толькі тут многія з нас адчулі, якой любоўю і якой увагай наш народ акружае **сваю совецкую інтэлігенцыю,** з якімі клопатамі ён да яе адносіцца. Вы бачыце, як уся краіна сочыць за работамі з'езда, як чула рэагуе яна на кожнае выступленне пісьменнікаў. Гэта было ярка прадэманстравана тут, на з'ездзе, у выступленнях шматлікіх дэлегацый рабочых, калгаснікаў, прадстаўнікоў Чырвонай арміі і флота, моладзі, работнікаў другіх галін мастацтва.

Гэта мы бачылі ў Маскоўскім парку культуры і адпачынку, у Зялёным тэатры, дзе сабраліся дзесяткі тысяч маскоўскіх пролетарыяў для таго, каб горача вітаць з'езд совецкіх пісьменнікаў. І калі прысутныя на гэтым свяце пісьменнікі ўбачылі дзесяткі тысяч глядачоў, гэты велізарны амфітэатр пад адкрытым небам, месяц, які вісеў над гэтым амфітэатрам (прычым пісьменнікі пыталіся, няўжо і гэты месяц падвешан там дырэктарам парка), то ў многіх з іх нявольна ўсталі ў ваабражэнні незабыўныя карціны, антычнай Грэцыі, дзе мастацтва было неразрыўна звязана з народам.

«А добра-б на гэтай сцэне паставіць «Эдыпа»,—вырвалася тады ў А. Талстога. «Або наладзіць спаборніцтва паэтаў і песняроў»,—дадаў хтосці.

Ці не здаецца вам, таварышы, што цяпер, на другой ступені гістарычнага развіцця, у век электрычнасці, радыё, у век соцыялізма і совецкай улады ў нашай краіне, да нас прышлі лепшыя часы мастацтва, калі народ і мастак складаюць адно цэлае. У нас знікаюць патроху літаратурныя снобы, якія ў гасцінных, шчыльна зачыніўшы дзверы, аглушаюць адзін другога вітыеватымі тырадамі. У нас народ ведае **сваіх** пісьменнікаў. Ён абмяркоўвае на фабрыках і ў калгасах, у дамах і клубах Чырвонай арміі кожны новы твор. У нас кожная добрая песня ў момант аблятае ўсю краіну ад Беларусі да берагоў Ціхага акіяна.

І не дарма тут, на з'ездзе, і ў дакладзе А. М. Горкага, і ў выступленнях пісьменнікаў так многа гаварылася аб народнай творчасці. Так, у нас народ зноў вылучае сваіх песняроў, сваіх мастакоў. Кожны год падымаюцца новыя і новыя сілы, новыя пісьменнікі, якія выводзяць з асяродзішча рабочых і калгаснікаў, і якія часамі першым-жа сваім творам становяцца вядомымі ўсёй краіне.

Тав. Стаўскі сёння расказваў аб гэтых маладых пісьменніках, якіх становіцца ўсё больш з кожным годам, бо расце наша культура.

З другога боку, і тыя мастакі, якія раней былі абасоблены, цяпер, прышоўшы к пролетарыяту, прыняўшы платформу совецкай улады, сталі бліжэйшымі і роднымі для нашага народу.

Калі тут выступалі прадстаўнікі рабочых і калгаснікаў, яны нам гаварылі: апішыце наш рост, нашу барацьбу за соцыялізм.

Кожны чалавек, які з гэтай трыбуны вітаў з'езд, пачынаючы ад маскоўскай калгасніцы, гаварыўшай бліскучай маляўнічай мовай, і канчаючы майстрам завода імя Сталіна, створан рэволюцыяй, загартоўваўся ва ўпартай барацьбе за таржэство соцыялізма.

Мне ўспамінаюцца некаторыя мудраванні нашых крытыкаў, якія часам ходзяць вакол ды каля некаторых асноўных палажэнняў, якімі кі руюцца нашы пісьменнікі, і сваімі разважаннямі прабуюць выпуставіць сэнс гэтых палажэнняў. Вядома палажэнне Энгельса аб тым, што мастаку неабходна паказваць тыповыя характары ў тыповых абставінах. І вось, калі гаварыць аб тых характарах прадстаўнікоў рабочых, калгаснікаў, Чырвонай арміі, якія з'яўляліся тут на гэтай трыбуне, то ніхто, як яны, не апраўдваюць з такой нагляднасцю гэтага палажэння Энгельса. Бо гэтыя характары былі створаны ў тытанічнай класавай барацьбе, якая разгортвалася ў нашай краіне ўсё гэтыя гады.

Некаторыя разважаюць так: ну з першым палажэннем Энгельса адносна тыповых характараў мы можам памірыцца. Што датычыць другога палажэння адносна тыповых абставін, то гэта, уласна кажучы, ні к чаму. Гэта з'яўляецца, па-моему, буйнейшай памылкай. Мы не можам зразумець і мы не можам паказаць ні аднаго характара, це паказваючы таго, як гэты чалавек змагаўся, з якімі перашкодамі, з якімі ворагамі, і як, ён у гэтай барацьбе загартоўваўся.

Уся наша партыя, партыя Леніна-Сталіна, вырасла і загартавалася ў барацьбе за соцыялізм. У гэтай барацьбе загартаваўся і рабочы клас. Нашы мастакі павінны даць адчуць і зразумець гэта ў сваіх творах. Яны павінны знайсці чысты нявялікія дробныя рысы, якія найлепш адцяняюць вось гэта аспоўнае ў станаўленні, у стварэнні характараў у нашай краіне.

ЧЭЛЮСКІНЦЫ—ВОБРАЗ ГЕРАІЧНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА

Тут выступаў Отто Юльевіч Шмідт. Ён сказаў нешта простае на першы погляд, але вельмі значнае, на што, як мне здаецца, нашым пісьменнікам трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу. Отто Юльевіч сказаў: «У Арктыцы, на льдзіне, у най трудней шых, трагічных абставінах у людзей паявіліся тыя якасці, якія раней знаходзіліся ў іх у скрытым стане, але якія былі выхаваны краінай Советаў».

Перада мною кніга, якую трэба раздаць дэлегатам з'езда, на якую, я думаю, вы ўсе звернеце ўвагу. Аб гэтай кнізе, на жаль, ніхто не гаварыў на з'ездзе. Гэта кніга называецца «Як мы выратавалі чэлюскінцаў». Героі Совецкага Саюза не сталі чакаць, калі нашы пісьменнікі натхняцца і апішуць іх подвіг на ледзяных палях Арктыкі. Яны **самі** ўзяліся за справу і на працягу двух месяцаў **самі** напісалі гэту кнігу. Тут у простых, няштучных словах кожны з лётчыкаў—Ляпідзеўскі, Леванеўскі, Слепнёў, Молакаў, Каманін, Вадап'янаў, Даронін расказваюць аб сваім жыцці, як яны вучыліся, як тварылі свае гераічныя подвігі.

Гэта выдатная кніга. Гэта—кавалак жыцця. Гэта адна з самых цікавых кніг, якія з'явіліся за апошні час. З'яўленне яе гаворыць аб тым, што наш народ вылучыў такіх герояў, якія не толькі робяць подвігі, але ўмеюць расказваць і аб сабе, і аб подвігах. Гэта новае з'явішча ў нашай літаратуры.

Калі вы прагледзіце гэту кнігу, вы ўбачыце, што гэта за людзі. Адзін нарадзіўся ў падмаскоўнай вёсцы, другі—пад Ленінградам, трэці—ў Палтаве. Іх жыццёвы шлях быў розны. Многія з іх не сустракаліся адзін з другім да Ванкарэма і Уэлена. Але папаўшы туды, яны сталі дзейнічаць разам, як сталёвы атрад рэволюцыі. **(Апладысменты).**

Хто стварыў іх? Прачытаўшы гэту кнігу, вы ўбачыце, што гэтых людзей стварыла рэволюцыя.

І калі наш народ ушаноўваў чэлюскінцаў, то ён ушаноўваў у іх не толькі іх асабістую мужнасць і гераізм. Можа быць, у пісьменніка, які пачне апісваць гэты подвіг, ён абрысуецца як адзін з прыкладаў асабістага гераізма, асабістай мужнасці, якіх даволі многа. Гэта было-б, найвялікшай памылкай. Не, кожны з гэтых людзей мае сваю гісторыю. І тое, што рабілася на льдзіне, таксама мае сваю гісторыю. І калі наша краіна ўшаноўвала герояў Арктыкі, краіна бачыла ў іх свой вобраз, яна бачыла ў тым, што адбывалася на льдзіне, вобраз усёй краіны Советаў, вобраз гераічнага пролетарыята. Там сказаліся дзве якасці, якія адрозніваюць нашы працоўныя масы—сказаўся гераізм, які правяў наш народ пад кіраўніцтвам рабочага класа, калі ён упершыню ў гісторыі пракладаў дарогу новаму будучаму, новаму ладу, і сказалася **найвялікшая арганізаванасць,** без якой гэты гераізм адарваўся-б ад зямлі, быў-бы безгрунтоўным, без якой не маглі быць створаны ўсе гэтыя вялікія справы.

НАПІШАМ ТВОРЫ, ВАРТЫЯ НАШАЙ ВЫДАТНАЙ ЭПОХІ

Гэта мае велізарнае значэнне для мастака, для мастацкай творчасці. Адзін з класікаў, які даўно памёр, але «прысутнічае» на даным з'ездзе, сказаў, што рэалізм, які не бачыць далёй кончыка свайго носа, горш усякай шалёнай фантастыкі, **бо ён слеп.**

Прыклад чэлюскінцаў вучыць мастака, што нельга абмяжоўвацца адной фатаграфіяй, нельга абмяжоўвацца знадворным апісаннем падзей. Мастак павінен знайсці такія рысы, якія выявілі-б сувязь з'яў, якія-б паказалі, адкуль вырас чалавек, адкуль узяліся тыя якасці, якія дазволілі тварыць цуды **гераізма,** цуды **арганізаванасці,** якімі захапляўся ўвесь свет.

Тут многа гаварылася аб тым, што наша мастацтва павінна быць багата зместам. Гэта зусім правільна. У нас цяпер ужо няма адкрытых абаронцаў фармалізма. Праўда, знаходзяцца яшчэ людзі, якія заклінаюць фармалізм, і ў той-жа час працягваюць яго ў сваіх творах або ў крытыцы. Такога роду выпадкі, на жаль, яшчэ бываюць. Але ў барацьбе з беззмястоўным мастацтвам, з мастацтвам, якое з'яўляецца адлюстраваннем гніення і распаду буржуазнага свету, мы ўжо атрымалі рашаючую перамогу. І наш мастак усведамляе, што ён павінен у сваім творы даць не проста прыгожую разетку, а даць **багаты зместам** твор, які-б натхняў, клікаў і вабіў наперад. Мне здаецца, што мастак, шукае тады, калі ён творыць, калі ён стварае свой твор і калі ён ўсе сілы напружвае для таго, каб вобразы яго твору, кожная думка, кожнае пачуццё, кожнае слова дайшлі да сэрца чытача. І ў гэтых адносінах А. М. Горкі дае нам прыклад. Яго творы ўсе зроблены так, што іх вельмі добра разумее масавы чытач. Там адточана кожнае слова і кожная фраза, там любоўна зроблен кожны вобраз, і ўсё накіравана да таго, каб гэты твор знайшоў водгук у сэрцы чытача. Іменна да гэтага павінен імкнуцца кожны сапраўдны мастак.

Таварышы, тут выступала многа прадстаўнікоў нашых новых чытачоў. Яны прыходзілі з усіх канцоў нашай Совецкай краіны. Яны выходзілі на гэту трыбуну і гаварылі: мы вас, совецкіх пісьменнікаў, любім, мы вас шануем, але мы чакаем ад вас, што вы дасце нам новыя песні, новыя творы, у якіх выліўся-б паток новых пачуццяў і думак. Мы хочам, каб вы пісалі творы, якія-б натхнялі, клікалі наперад, у якіх былі-б адлюстравана ўсё наша асляпляюча-маляўнічае шматграннае жыццё і работа. Яны прыходзілі сюды, на трыбуну з'езда совецкіх пісьменнікаў і зварачалі да з'езда совецкіх пісьменнікаў, да лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі свае надзеі і патрабаванні.

Адказ можа быць толькі адзін: так, мы створым новае мастацтва, мастацтва свабоднага народу. Так, мы створым мастацтва соцыялізма. **(Бурныя апладысменты).**

НА ЎСЕСАЮЗНЫМ З'ЕЗДЗЕ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ. Кочерга (Украіна), Жанрышар-блок (Францыя) і Янка Купала (Беларусія).

ЗАВЯРШЫЦЬ ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ

РАССТАВІЦЬ АКТЫЎ ТАКІМ ЧЫНАМ, КАБ АХАПІЦЬ КОЖНЫ КАЛГАС, КОЖНЫ АДНААСОБНЫ ПАСЕЛАК

ЛІБЕРАЛЬНІЧАЮЦЬ З САБАТАЖНІКАМІ

УШАЧЫ. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Пасля таго, як Ушацкі раён быў занесен на чорную дошку, тэмпы хлебаздачы значна павялічыліся. За пяцідзённую з 10 па 15 жніўня раён даў прыросту 19 проц. Але як толькі раён быў зняты з чорнай дошкі, тэмпы хлебапаставак знізіліся, больш чым напалову. 22 жніўня райком і МТС атрымалі тэлеграму ЦК і палітсэктара аб недапушчальным адставанні раёна. Райком зноў забіў трывогу. Тэмпы паставак узмацніліся, а далей зноў супакоіліся.

Работа рыўкамі з'яўляецца характэрнай для ўшацкіх раённых арганізацый. Іменна гэта з'яўляецца асноўнай прычынай таго, што раён па выкананню плана хлебапаставак займае 65-е месца ў рэспубліцы.

Між тым Ушацкі раён мае ўсе магчымасці, каб датэрмінова выканаць гадавы план. У раёне ёсць 29 складаных і поўскладаных малатарань, апрача вялікай колькасці конных і ручных малатарань.

Значыць справа, галоўным чынам у няўменні арганізаваць абмалот і здачу збожжа. Аб тым, што справа іменна ў гэтым, сведчаць наступныя факты.

Калгас «Чырвоная Дзвіна» 22 закончыў здачу жыта. Аднак 23-24 і ў наступныя дні ён усё яшчэ малаціў жыта, а да малацьбы пшаніцы, ячменю і аўсу для здачы дзяржаве яшчэ не прыступіў.

У калгасе «Перамога». Марачынская сельсовета, прыступілі да малацьбы пшаніцы і бабовых толькі тады, калі ўсе астатнія культуры былі абмалочаны.

Калгасы «Сіла», Усайскага сельсовета, і «Бязбожнік», Перапоўскага сельсовета, выканаўшы план здачы збожжа дзяржаве, на 50 проц. не звярнуўшы ні аднаго фунта ўзятай насеннай пазыкі, спынілі малацьбу. Старшыня калгаса «Сіла» **Крыжанок** сам загадаў спыніць малацьбу.

Здаць дзяржаве яшчэ паспеем, — гаворыць ён.

Такія размовы ёсць у радзе другіх калгасаў раёна. Яны ніякага адпору з боку раённых арганізацый і палітаддзела не атрымліваюць.

Яшчэ горш справа па аднаасобнаму сектару. План хлебапаставак выкананы усяго на 44,1 проц. У гэтым вінаваты РВК і камітэт загатовак, якія яўна лібералнічаюць з сабатажнікамі. Сабатаж звычайна пачынаецца і ўзначальваецца асобнымі членамі сельсовета. Члены Гаралацкага сельсовета а в. Новасёлкі **Пятніцкі і Журносек** у 1933 годзе не выканалі плана хлебапаставак і ў гэтым годзе яшчэ ні аднаго фунта не здалі. Іх прыкладу следуюць і астатнія аднаасобнікі гэтага сельсовета. У ніі аднаасобнікі гэтага сельсовета. У выніку план па гэтаму сельсовету выкананы усяго на 20 процантаў.

У Куплінскім, Весніцкім і В. Далескім сельсавеце, таксама многа аднаасобнікаў не выканалі сваіх абавязкаў. Але ні сельсоветы, ні раённыя арганізацыі не прымаюць да сабатажнікаў ніякіх мер.

НЕЙДЛІН.

НЕДАПУШЧАЛЬНЫЯ СТРАТЫ ПРЫ МАЛАЦЬБЕ

ЧЫРВОНАПОЛЛЕ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Уборка зерневых па калгасах раёна праходзіла пры вялікіх стратах. У асобных калгасах («Смычка»), страты дасягнулі больш 3.600 кіло. Гэта больш, чым калгас павінен здаць дзяржаве. Яшчэ большых размераў дасягаюць страты ў малацьбе.

У калгасе «Чырвоны араты», Кажамяціцкага сельсовета (старшыня Камшэка) у абмалочанай пшаніцы асталося 30 проц. ураджаю, у аўсе — 20 проц.

— Чысцей вымалацім пасля, зараз трэба пастаўкі выконваць.

Салома з невымалачаным ураджаем складаецца на дварэ, неакуратна. Намочыць дождж—усё зярно прарасце. Частка ўжо зараз прарасла.

Такое-ж становішча і ў калгасе **«Звязда Окцября»,** Пачапоўскага сельсовета, дзе не вымалачана жыта да 20 проц., і ў радзе другіх калгасаў. Старшыні калгасаў не хочуць зразумець, што такім шкодніцкім абмалотам яны катастрафічна зніжаюць вагу працадня.

М. ВІШНЕЎСКІ.

У АВАНГАРДЗЕ ХЛЕБАПАСТАВАК

Калгасы зоны БЕШАНКОВІЦКАЙ МТС 30 жніўня выканалі поўнасцю гадавы план хлебапаставак і звярнулі насенную пазыку дзяржаве.

Начальнік палітаддзела ЗІНОЎЕЎ.
Упаўкамзаг ФАЛЬКОВІЧ.

Калгасы РАСОНСКАЙ МТС 31 жніўня выканалі поўнасцю гадавы план хлебапаставак.

Дырэктар МТС ГАНЧАРЭНКА.
Начальнік палітаддзела АСАДЧЫ.
Упаўкамзаг ЯКУБОВІЧ

Калгасы ГАРАДОЦКАЙ МТС на 29 жніўня выканалі гадавы план абавязковых хлебапаставак.

Дырэктар МТС ГЕЙНЕ.
Нач. палітаддзела БЛЮМКІН.
Райупаўкамзаг НОВІКАЎ.

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу).

31 жніўня калгасы зоны Магілеўскай МТС поўнасцю выканалі гадавы план натураплаты.

Дырэктар МТС ВАНЧУК.
Начальнік палітаддзела ЛЕВІН.
Упоўкамзаг ХАВІЧ.

ЗАКОНЧЫЛІ АЗІМУЮ СЯЎБУ

Соўгасы імя СВЕРДЛОВА (дырэктар ПУКШАНІС), «ХАРОМЦЫ» (дырэктар ЛУПСЯКОЎ), «КУРГАНЫ» (дырэктар КАЛЯДА) закончылі азімую сяўбу.

М.

Пастанова Цэнтральнай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю

За невыкананне плана хлебаздачы чырвоны сцяг ЦСПСБ і ўпаўнаркомсоўгасаў адабраць ад СОЎГАСА ІМЯ СВЕРДЛОВА. Камісія лічыць, што за прашоўшыя пяцідзённі ні адзін з соўгасаў сістэмы ўпаўнаркомсоўгасаў не заваяваў права на атрыманне сцяга.

Кандыдатамі на атрыманне сцяга запісаць СОЎГАС ВАРОНІЧЫ і СОЎГАС БАБІНІЧЫ, папярэдзіўшы кіраўніцтва гэтых соўгасаў аб неабходнасці ў бліжэйшую пяцідзённку поўнасцю звярнуць дзяржаве харчовыя, насенныя і іншыя пазыкі, поўнасцю выканаць план азімай сяўбы і забяспечыць рашучы перапом у выкананні плана сіласавання і ўздыму зяблівы.

За датэрміновае выкананне плана хлебаздачы занесці на чырвоную дошку ГОМЕЛЬСКІ МАЛПРОМТРЭСТ, кандыдатам на чырвоную дошку запісаць АРШАНСКІ трэст, папярэдзіўшы гэтыя трэсты аб неабходнасці ў бліжэйшую пяцідзённку поўнасцю выканаць планазварот харчовай і насеннай пазыкі, завяршыць азімую сяўбу і забяспечыць рашучы зрух у ходзе сіласавання і ўздыму зяблівы.

За поўнае выкананне хлебаздачы па ўсіх відах і паспяховае выкананне плана сіласавання, азімай сяўбы і зяблівага ворыва пакінуць на чырвонай дошцы соўгасы: «ХАЛЬЧ» і «КАПАЦЭВІЧЫ», дадаткова занесці на чырвоную дошку соўгасы: «РУДАКОВА», «АСВЕЯ», кандыдатамі на чырвоную дошку запісаць соўгасы «УВАРАВІЧЫ» і «КОМСАМОЛЬСКАЯ ПРАЎДА», ўказаўшы кіраўніцтву гэтых соўгасаў аб неабходнасці забеспячэння ў бліжэйшую пяцідзённку рашучага перапому ў тэмпах сіласавання і зяблівага ворыва.

За зрух у выкананні плана хлебапаставак зняць з чорнай дошкі соўгасы «АДАМЕНКА», «КУЛІКАЎКА», «САКОЛКА», «М.-СЛЯПЯНКА», «РЭПІШЧА», «ПОЛЕЛЮМ», «ЧЫРВОНЫ БЕРАГ», «ЗОРКА ЗАХАДУ», указаўшы кіраўніцтву гэтых соўгасаў на неабходнасць яшчэ большага ўзмацнення тэмпаў азімай сяўбы, сіласавання і зяблівага ворыва.

За ганебны зрыў чарговых мерапрыемстваў па барацьбе за ўраджай і стварэнне кармовай базы панінуць на чорнай дошцы соўгасы: «РУБЕЖ», «СВІСЛАЧ», «ЗАБЕГІ» і занесці дадаткова на чорную дошку соўгасы «Далёкая ніва», «Рудабелка», «Астравы», «Пяцігодка». Кандыдатамі на чорную дошку занесці соўгас «Гаршчэўшчына».

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За паспяховае правядзенне чарговых мерапрыемстваў па барацьбе за ўраджай і стварэнне кармовай базы занесці на чырвоную дошку наступныя соўгасы:

«БАБІНІЧЫ», Аршанскага раёна, дырэктар **БЕРНШТЭЙН.**

«КАПАЦЭВІЧЫ», Старобінскага раёна, дырэктар **СУШКО.**

«ХАЛЬЧ», Жлобінскага раёна, дырэктар **РЫЎКІН.**

«ВАРОНІЧЫ», Полацкага раёна, дырэктар **ГОЛУБЕЎ.**

«РУДАКОВА», Хойніцкага раёна, дырэктар **АБРАМОВІЧ.**

«АСВЕЯ», Асвейскага раёна, дырэктар **КЛЮШНІКАЎ.**

ЧОРНАЯ ДОШКА

За ганебны зрыў чарговых мерапрыемстваў па барацьбе за ўраджай і стварэнне кармовай базы занесці на чорную дошку наступныя соўгасы:

«РУБЕЖ», Талачынскага раёна, дырэктар **ВІЛЕНЧЫК.**

«СВІСЛАЧ», Асіповіцкага раёна, дырэктар **ЗАХАРЭЦ.**

«ДАЛЬНЯЯ НІВА», Чавускага раёна, дырэктар **БАШКО.**

«ЗАБЕГІ», Плешчаніцкага раёна, дырэктар **ГЕРАСІМЕНКА.**

«РУДАБЕЛКА», Глускага раёна, дырэктар **ЛЕШЫН.**

«АСТРАВЫ», Клічаўскага раёна, дырэктар **КОЛЬЯНАЎ.**

«ПЯЦІГОДКА», Смалявіцкага раёна, дырэктар **ТРУШКО.**

ЗЯРНО ЗАСТАЕЦЦА У МЯКІНЕ

ШКЛОЎ. (АД карэспандэнта «Звязды»).

Фашчаўская МТС на поўскладанай малатарні БДО-34 праводзіла малацьбу ў калгасе імя Фрунзе, Княжыцкага сельсовета. Пяць дзён назад малацьба спынена. Малатарня стаіць, уросшы ў салому-мякіну і збожжа.

Раскіданая салома перамяшалася з немалочаным збожжам. На кожным кроку—груды збожжа, у якім шмат добраякаснага зярна. Па каласах шчыльна ўсталёўшых зямлю, топчуцца людзі, коні і рыюцца свінні. У мякіне таксама шмат зярна.

У вялікай грузе ляжыць каля 300 пудоў аўса змалочанага 8 дзён назад, але не веянага. Ён гарыць, гніе, але ніхто гэтага не хоча бачыць, ніхто не прымае ніякіх мер.

Збожжа раскрадваецца. Старшыня калгаса Халюкоў сістэматычна п'янствуе, загадчык гаспадаркай Бабкоў таксама. Учоту няма. Збожжа дзяржаве адпраўляюць без вагі. Яго кралі пудамі, мяхамі.

У адну ноч пакралі 18 мяхоў з ведама праўлення, нібы таму, каб менш плаціць натуралаты МТС.

У калгасе жыве агранам МТС **Крупадзёраў,** інструктар **Сляпцеў.** Яны пакрываюць злачынцаў. Дырэкцыя, палітаддзел МТС таксама нічога не робяць, каб вывесці калгас з прарыву.

Амаль не лепшы малюнак у калгасе «Спартак», пад носам МТС, у вакне палітаддзела (начальнік тав. **Індзюкоў**).

Тут таксама 3 дні стаяла складаная малатарня МК — 1100. Тры дні ляжала збожжа пад малатарняй, рассыпанае вялікімі кучамі.

Страты пры малацьбе дасягаюць злачынных размераў.

РУДНЯНСКІ.

ШТУЧНА ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ СЯЎБУ АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ

ЧЭРЫКАЎ, 28. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

У радзе сельсоветаў Чэрыкаўскага раёна мае месца яўнае супраціўленне сяўбе азімай пшаніцы. Аб гэтым красамоўна гаворыць той факт, што з патрэбных засеяць 350 га пшаніцы на 25 жніўня засеяна толькі 13.

Адзіным аргументам, які выстаўляюць у сваё апраўданне старшыні большасці сельсоветаў —гэта нібы адсутнасць насеннай пшаніцы. Наколькі беспадстаўна гэта спасылання, паказвае наступны факт:

У Глінскім сельсавеце сабралі насеннай пшаніцы больш, чым на 120 га, а ўвесь план сяўбы пшаніцы ў сельсавеце складае толькі 90 га. У калгасе «Чырвоны сцяг», Лабанаўскага сельсовета, насенная пшаніца на 70 га, а ўвесь план сельсовета складае толькі 80 га. Аднак, калгас «Чырвоны сцяг», як і ўсе астатнія калгасы гэтага сельсовета, да сяўбы пшаніцы не прыступіў.

Адсюль ясна, што справа не ў адсутнасці насення. Насення ў раёне хапае. Справа ў прамым супраціўленні раду кіраўнікоў калгасаў прасоўванню на калгасныя палі гэтай каштоўнейшай культуры.

«Антышпанічныя» настроі квітнеюць не толькі ў калгасах, але і ў райземаддзеле. Чым-жа другім тлумачыцца тое, што да гэтага часу райза не арганізаваў упутрараённы абмен насеннай пшаніцы? Чым вытлумачыць і другі факт, што райза да гэтага часу не дала калгасам разгорнутых аграпаказанняў аб сяўбе азімай пшаніцы?

Дзіўна толькі, чаму райком і РВК прымірыліся з такім становішчам?

АРЦЕМ СТАЛЬ.

Парушаюць пастановы ўрада

КРЫЧАЎ. (Па тэлеграфу).

У Крычаўскім раёне пасевы, засеяныя па цаліне і раскарчоўках, незаконна абкладаюцца хлебапастаўкамі. Патрабуецца тэрміновае ўмяшанне рэспубліканскіх арганізацый.

Начальнік паліта

ЯК Я КІРУЮ ФАБРЫКАЙ

(З блок-нота дырэктара)

...Сярод віцебскіх прадпрыемстваў першае месца займае панчошна-трыкатажная фабрыка **імя Клары Цэткін.** Промфінплан першага паўгоддзя фабрыка выканала на **105,3 проц.** Запраектавана планам выпусціць прадукцыі на суму **6.162.141 руб.**, а выпушчана на **6.492.937 руб.**

З поспехам выкананы якасныя паказальнікі промфінплана. Замест планавых **72,4 проц.** прадукцыі першага гатунку выпушчана **76 проц.** Дапускаемая планам штопка (брак) у размеры **19 проц.** знижана да **12,5 проц.** Сабекошт знижан на **6,55 проц.** замест запраектаваных планам **4,4 проц.** У выніку перавыканання паказальніка па зніжэнню сабекошту фабрыка атрымала **39.000 руб.** эканоміі. І, нарэшце, па апошнаму паказальніку — прадукцыйнасці працы — фабрыка таксама дабілася вялікага поспеху. Сярэдняя прадукцыйнасць працы работніка роўна **105 проц.**

З такімі тэмпамі фабрыка прадаўжае працаваць і зараз. Ідзе пасяховая барацьба ўсяго рабочага калектыва, усёй парганізацыі фабрыкі за практычнае ажыццяўленне рашэнняў майскага пленума ЦК КП(б)Б.

На светлым фоне сістэматычных поспехаў работы фабрыкі асабліва вылучаецца постаць яе дырэктара **т. Ханінай**, як кіраўніка ўсім гаспадарчым жыццём гэтага вялікага прадпрыемства.

Яна расказвае.

— Я зразумела, што поспех работы таго ці іншага ўчастка залежыць цалкам ад жывога чалавека, выключна ад таго, хто гэтым участкам кіруе. І таму, галоўную ўвагу я звярнула **на забеспячэнне вытворчых участкаў фабрыкі праверанымі, вопытным кадрам начальствуючага складу.** Напрыклад, начальнікамі вязальнага і швэйнакацельнага цэхаў я прызначыла майстроў-спецыялістаў па панчошна-трыкатажнай справе, вопытных работнікаў, працаваўшых у гэтай галіне шмат гадоў — тт. **Фрумес** і **Вайнштэйн.** Тое самае магу сказаць і ў адносінах начальнікаў змен. Таварышы **Леў, Карэліна** — начальнікі змен — з'яўляюцца старымі кваліфікаванымі работніцамі, якія добра авалодалі тэхнікай панчошна-трыкатажнай справы. Таксама і ў трыкатажным цэху. Тут начальнікам і памочнікам начальніка змены працуюць выключна інжынеры.

Паколькі на чале вытворчых участкаў знаходзяцца тэхнічна-граматныя людзі, я маю магчымасць **патрабаваць** ад іх узорнай пастаноўкі кіраўніцтва падправаджанымі ім цэхамі, зменамі, брыгадамі, як: увядзенне правільнага тэхнала гічнага працэсу, правільнай арганізацыі працы, увязкі паміж працэсамі і асобнымі ўчасткамі.

Мы працуем **выключна** па **тэхпромфінплану** і таму забеспячэнне кіраўніцтва вытворчымі ўчасткамі тэхнічна граматнымі людзьмі мае асабліва важнае значэнне, бо тэхпромфінплан не сумяшчальны нават з **малейшым саматужніцтвам і анархіяй** у працэсах і аперацыях, ён **патрабуе для кожнага руху людзей і машын абсалютна дакладнага тэхнічнага разліку.**

Начальнік цэха павінен быць поўным гаспадаром свайго цэха, таксама як і начальнік змены ў сваёй змене і брыгадзір у сваёй брыгадзе. Такая мая абавязковая ўмова ўсяму нізавому і сярэдняму начальствуючаму складу фабрыкі. Мы далі ўсім начальнікам цэхаў, памочнікам і начальнікам змен поўную самастойнасць у іх рабоце. Начальнік цэха, напрыклад, мае свой ліміт, устанаўляе норму выдаткавання сыравіны, робіць самастойныя заяўкі на рабочую сілу, сыравіну, інструменты, адным словам — усё, аж да звальнення з работы. Больш таго, мы яму нават адпусцілі спецыяльны фонд для прэміравання лепшых рабочых па яго асабістаму погляду.

Але сказаць начальніку цэха або змены, што ты, моў, адказваеш за цэх ці змену — гэта лягчэй за ўсё. Трэба было прадпрыняць штонебудзь такое, што магло-б забяспечыць патрэбнае кіраўніцтва ў цэху, а іменна: каб людзі зразумелі **сутнасць адзіначалля.** Над гэтым пытаннем фабрычнае кіраўніцтва і ў прыватнасці я асабіста многа думалі і ў выніку правялі адно каштоўнае мерапрыемства. Мы выпрацавалі **«Правы і абавязкі»** для кожнага начальніка цэха, яго памочніка, начальніка змены, брыгадзіра, кантралёра, майстра, рабочай брыгады — аж да падносчыцы поўфабрыкатаў. У гэтым выпадку падыход быў выключна дыферэнцыяваны, выходзячы з асаблівасцей цэха і вытворчага ўчастка. Мы таксама ўключылі пункт аб тым, за што кожны з вышэйпералічаных таварышоў адказвае, за што іменна кожны з іх нясе адказнасць. І цяпер кіраўнік цэха або, скажам, змены ўжо не працуе ўслепую, не блытаецца ў стаячых перад ім складаных пытаннях, ведае што яму патрэбна рабіць і за што ён адказвае.

Рэзультат ад усяго гэтага мы атрымалі вельмі добры. З маючыхся ў мяне шматлікіх прыкладаў я абмяжуюся адной характэрнай дэталлю. Я маю на ўвазе ў даным выпадку зусім новыя моманты ў рабоце начальнікаў цэхаў і змен. Калі да апошняга часу начальнік цэха займаўся пытаннем якасці, то гэта патрэбна было разумець, што ён працуе над тым, каб панчоха, скажам, была стандартнай, плотнай і т. д., але ніяк не падборам колеру для панчохі. А вось зараз, пасля таго як ён азнаёміўся з сваімі правамі і абавязкамі і адчуў персанальную адказнасць за даручаную яму справу, ён пачаў гэтай справай займацца. Такое пытанне, як спалучэнне рысункаў для панчохі, стала неад'ёмнай важнейшай часткай работы начальніка цэха, яго памочніка або начальніка змены. І гэта зразумела. Яны гатовы пайсці на ўсё, абы панчоха, выпушчаная з яго ўчастка, адказвала абсалютна ўсім патрабаванням.

У рабоце цэхаў паладзіў заключэнне гаспадарчых дагавароў. Такі дагавор заключан паміж швэйна-кацельным і вязальным цэхамі. У дагаворы ўвялі спецыяльныя пункты аб штрафах і няўстойках за ўзаемную здачу недобраякаснага поўфабрыката. Гэтыя дагаворы таксама ўзмацняюць адказнасць кіраўнікоў цэхаў і ўчасткаў.

Праверка і кантроль выкананых даных мною распараджэнняў — стрыжань маёй работы. У мяне ёсць спецыяльны спытак, у якім запісаны важнейшыя мае загады і распараджэнні і паказаны даныя мною тэрміны для выканання. Яшчэ да сканчэння тэрміну я іду непасрэдна **ў цэх** або выклікаю начальніка цэха да сябе і **правяраю** ход выканання маіх распараджэнняў. Калі я бачу, што мае загады проста ігнаруюцца, тады я, скарыстоўваючы свае правы адзіначалля, даю спагнанне. Але бывае, што таварышу проста не пад сілу выканаць маё ўказанне. У гэтых выпадках я прымаю ўсе захады да таго, каб таварышу дапамагчы. Характэрны прыклад. Тав. **Вілічынская** — начальнік змены матальнага цэха — не прапрацавала як патрэбна быць тэхпромфінплан сваёй змены, хоць наконт гэтага мною была дана строгая дырэктыва. **Якая можа быць размова аб выкананні тэхпромфінплана на зме не, калі начальнік змены яшчэ як след сам яго не асвоіў.** Але я ўпэўнілася, што т. **Вілічынскай** гэта справа даецца з труднасцямі. Я тут-жа прымацавала да змены **Вілічынскай** тэхкіраўніка фабрыкі т. **Гаравога,** які прапрацаваў тэхпромфінплан не толькі з т. **Вілічынскай,** але і з брыгадзірамі.

Але бываюць выпадкі, калі ў неадкладным аказанні дапамогі таварышу свядома адмаўляю і гэта раблю правільна. У якіх гэта бывае выпадках?

Аднойчы да мяне заходзіць начальнік матальнага цэха тав. **Рафельсон** і просіць, каб я ёй паказала, як лепш вытварыць пераразпраўку прадзіва. Замест таго, каб адказаць ёй па сутнасці, я тут-жа задаю ёй пытанне: «Ну, а ты сама, як начальнік цэха, над гэтым пытаннем думала? Якія наконт гэтага ёсць у цябе прапановы?» Тав. **Рафельсон** прышлося прызнацца, што яна асабіста аб гэтым нават не патурбавалася паварушыць мазгамі, а проста спадзявалася на мяне. Прышлося ёй указаць, каб яна раней дала мне свае прапановы, а потым ужо атрымае ад мяне асобныя дадатковыя ўказанні. Так яна потым і рабіла.

ТАВ. ХАНІНА

Як праходзіць мой рабочы дзень? Як правіла, мая першая задача, калі прыхажу на работу, — гэта **агляд цэхаў.** Дэтальна праверыўшы стан цэхаў, машын, я тут-жа раблю сабе адзнакі і на месцы прымаю меры да адхілення асобных недалікаў у рабоце цэхаў і ўчасткаў.

Прышоўшы з цэхаў, я перш за ўсё знаёмлюся па зводках з наяўнасцю прадзіва, тут-жа даю адпаведныя распараджэнні аддзелу снабжэння аб фарсаванні атрымання неабходнай гатунковасці прадзіва, а таксама цэхам аб лепшым рэгуляванні і выкарыстанні наяўнага прадзіва.

Услед за гэтым я знаёмлюся з выкананнем плана прайшоўшага дня па ўсіх цэхах, таксама даю цэхам неабходныя ўказанні, спачатку азнаёміўшыся з прычынамі павіжэння крывой промфінплана (калі гэта мае месца ў рабоце асобных вытворчых участкаў).

Даволі многа часу ідзе ў мяне на рэгуляванне фінансавых пытанняў. Аднак, я стараюся выкарыстаць услякую **свабодную мінуту, каб больш бываць непасрэдна ў цэху.**

У каляндарны план майго рабочага дня таксама ўваходзіць рад праводзімых мною вытворча-тэхнічных нарад з асобнымі зменамі і брыгадамі па вырашэнню цэлай сумы бягучых гаспадарчых пытанняў.

* * *

Тав. Ханіна — адзін з дырэктароў нашай прамысловасці, які рос, як гаспадарнік разам з ростам усёй прамысловасці, разам з ростам задач, высоўваемых перад прамысловасцю.

Працаваць культурна, без рыўкоў і штурмаў, без непатрэбнай мітусні — вось што характарызуе тып новага дырэктара. Гэтыя рысы ў значнай частцы ўласцівы тав. **Ханінай.**

У гэтым — прычына таго, што фабрыка не ведае прарываў.

Тав. СОРКІН — лепшы прыёмшчык 1-га цэха 42 фасона. 1-ай змены Менскай фабрыкі «Окцябр», 3 разы прэміраваны за барацьбу з бракам

ПІСЬМЫ рабочых і калгаснікаў

ПРАКУРОРУ РЭСПУБЛІКІ ТАВ. КУЗЬМІНУ
СТАРШЫНІ ЦСПСБ ТАВ. КАВАЛЬЧУКУ

ЗАМЕСТ ЗАРПЛАТЫ — АБЯЦАННІ

(ПІСЬМО АГРАНОМА)

У «Звяздзе» 10 жніўня змешчана маё пісьмо аб невыплаце мне і другім спецыялістам, працуючым у Талачынскім райземаддзеле зарплаты на працягу 3 месяцаў. З таго часу прайшло ўжо тры тыдні, а зарплату нам усё яшчэ не выдалі. Цяпер, як і раней, кіраўнікі райза толькі і робяць, што кормяць нас абяцаннямі.

Бухгалтар райфа Кірэеў, да якога я звярнуўся па гэтаму пытанню, яшчэ раз адказаў мне: «будуць грошы, выплацім». У рэзультаце такіх бяздушных адносін да мяне стварылася такое становішча, што хоць кідай усё ды ўцякай з раёна.

ФЕДАРЫНЧЫК.

АД РЭДАКЦЫІ:

«Звязда» за апошні час змяшчала не адно пісьмо аб фактах затрымкі радам гаспадарнікаў зарплаты рабочым і служачым цэлымі месяцамі. Дастаткова напомніць хоць-бы пісьмо тав. ЧУМАКОВА з Ушацкага леспрамгаса, змешчанае ў нумары за 23 мая; пісьмо рабочага соўгаса «Труды», Полацкага раёна, ДРАЗДОВА, змешчанага 2 ліпеня. На невыплату зарплаты па 2-3 месяцы скардзіўся у сваім пісьме і рабочы Тураўскага камбінатэ тав. ГРОЗМАН (глядзі «Звязду» за 22 ліпеня) і рад другіх.

Усе гэтыя пісьмы гавораць, ПА-ПЕРШАЕ, аб грубейшым парушэнні цэлым радам гаспадарчых арганізацый і ўстаноў неадназровых указанняў партыі і ўрада аб своечасовай выплаце зарплаты і, ПА-ДРУГОЕ, аб адсутнасці на месцах барацьбы з парушальнікамі гэтых дырэктыў. Лепшым пацвярджэннем гэтага з'яўляецца той факт, што ні на адно з пералічаных пісем мы да гэтуль не атрымалі ніводнага адказу ад асоб і арганізацый, куды накіроўваліся гэтыя пісьмы.

Нават профсаюзныя арганізацыі, чыім кроўным абавязкам з'яўляецца перш за ўсё хуткае рэагаванне на такога роду пытанні, як правіла, не праяўляюць на мясцах патрэбнай актыўнасці і напорыстасці ў справе суровага пакарання вінаватых. Не заўсёды ў такіх выпадках праяўляюць неабходную аператыўнасць і органы пракуратуры.

Вось чаму «Звязда», змяшчаючы сёння другое пісьмо тав. Федарынчыка з Талачынскага раёна, з усёй сілай падкрэслівае неабходнасць, каб гэта пытанне неадкладна было абмеркавана прэзідыумам ЦСПСБ і пракуратурай рэспублікі з тым, каб гэтым злачынствам быў пакладзен раз і назаўсёды канец.

ПРАКУРОРУ ПОЛАЦКАГА РАЁНА ТАВ. ГІНЗБУРГУ.

НАВЕСЦІ БОЛЬШЭВІЦКІ ПАРАДАК У ДОМЕ АДПАЧЫНКУ

(ПІСЬМО АДПАЧЫВАЮЧЫХ)

Адсутнасць нагляду і кантролю за работай дома адпачынку Рудня, Полацкага раёна, з боку раённых арганізацый і, у першую чаргу, з боку райпрофсавета, стварылі ў доме абстаноўку, спрыяючую бесперашкоднаму разбазарванню прадуктаў, якія адпускаюцца на ўтрыманне адпачываючых.

За тры апошнія месяцы — чэрвень, ліпень, жнівень — кіраўніцтвам і абслугоўваючым персаналам дома разбазарана: мукі пшанічнай 411 кгр., мяса 383 кгр., масла 96 кгр., цукру 196 кгр., хлеба белага 141 кгр., чорнага 431 кгр., макарон 100 кгр. і глушчаў 79 кгр.

23 жніўня адпачываючымі быў знойдзен бачок з калбасой вагою ў 2 кгр., які схавалі, каб у зручны момант вынесці яго. Мяса па накладной штодзенна адпускалася 25 кгр., а на самой справе клалі ў кацёл па 20 кгр. 5 кгр. ішло на пакрыццё недастачы, а таксама на кармленне розных «гасцей», прыязджаючых у дом адпачынку без ніякіх пуцёвак.

А «гасцей» гэтых бывае вельмі многа. Так, у сталоўцы разам з адпачываючымі ўвесь час харчуецца жонка і дзеці бухгалтара, загадчыка і іншых «сваіх» людзей. Без пуцёўкі былі цэлы месяц у доме адпачынку **Баркан** — жонка члена прэзідыума райпрофсавета з сынам, потым адпачываў цэлы месяц сам Баркан з другім сынам. 18 жніўня прыбыла адпачываць жонка намесніка старшыні райвыканкома з дачкой таксама без пуцёўкі.

Загадчык домам **Лаўкогіч** і кладаўшчык **Гатушкін** вельмі многа клапоцяцца аб тым, каб скласці найлепшыя ўмовы «гасцям» і зусім не клапоцяцца аб адпачываючых. У пакоях брудна, няма лямп, вечарамі адпачываючыя ўпоцемках разбіваюць сабе ілбы. Не выпісваюцца ні адзін экземпляр газеты ці журнала. Кормяць адпачываючых выключна дрэнна, не гледзячы на тое, што прадуктаў адпускаецца дастаткова.

Пара парадкамі дома адпачынку Рудня заняцца следчым органам.

РУБІНЧЫК, БУКАЦЭВІЧ.

САКРАТАРУ ПЛЕШЧАНІЦКАГА РК КП(б)Б ТАВ. ПАРОМЧЫКУ

КАЛІ МЫ АТРЫМАЕМ РАЗЛІК?

(ПІСЬМО РАБОЧЫХ-ГРУЗЧЫКАЎ).

Тры месяцы — люты, сакавік і красавік бягучага года — мы, у ліку 20 чалавек, працавалі на станцыі Жодзіна ля Менска па пагрузцы лесаматэрыялаў Плешчаніцкага леспрамгаса. Зарабілі мы каля 7000 рублёў, якія да гэтага часу не атрымалі.

На неаднаразовыя нашы заявы бюракраты з леспрамгаса адказвалі: «На днях разлічымся». Гэтае «на днях» цягнецца ўжо 5 месяцаў, а грошай мы так і не атрымалі. Пісалі аб гэтым Плешчаніцкаму райпракурору, але і той не палічыў сваім абавязкам уздзейнічаць на дырэкцыю леспрамгаса. Ці доўга яшчэ нам прыдзецца чакаць абяцанага.

Просім «Звязду» уздзейнічаць на кіраўніцтва леспрамгаса, каб яно хутчэй выдала нам зароблены грошы.

НІКІФАРОВІЧ, ЧАРАНОК, БУЛАЎСКІ, ДОБРАВОЛЬСКІ, МАСЛОЎСКІ, СЕМЯНОК.

АД РЭДАКЦЫІ:

«Звязда» лічыць зусім недапушчальным, што леспрамгас месяцамі затрымлівае зарплату рабочым. Звяртаем увагу райкома партыі на неабходнасць неадкладнага ўрэгулявання гэтага пытання і прыцягнення да адказнасці валакітчыкаў. Лічым таксама, што райком ацэніць патрэбным чынам і паводзіны райпракурора т. Меерзона, які да заявы рабочых-грузчыкаў аб невыплаце ім зарплаты аднёсся таксама бюракратычна, як і дырэкцыя леспрамгаса.

Па слядах пісем

„Бяздушныя адносіны да жывога чалавека"

Змешчаны ў «Звяздзе» 4 жніўня гэтага года артыкул «Бяздушныя адносіны да жывога чалавека» быў разгледжан на бюро Гомельскага ГК КП(б)Б.

Прыведзеныя ў артыкуле факты, як паведамляе аб гэтым гарком, поўнасцю адпавядаюць сапраўднасці. Старшыні Нова-Беліцкага горсовета ШТЭЙНБАХУ аб'яўлена вымова.

Бюро ГК пацвярджае абвінавачанне «Звязды» ў адрыве райсовета ад рабочых мас. Таму бюро ўхваліла на працягу бліжэйшых двух дэкад правесці справаздачы райсовета на прадпрыемствах — фабрыцы «Везувій», камбінаце імя Гікало і жыракамбінаце.

Партгрупе горсовета даручана зрабіць папярэдняе абследаванне работы Нова-Беліцкага райсовета. Адначасова Гомельскі райком паведамляе, што тав. Улявіцкай Розе прадастаўлена кватэра.

„Драпежніцкія адносіны да каня"

У «Звяздзе» № 111 ад 14 мая было змешчана пісьмо «ДРАПЕЖНІЦКІЯ АДНОСІНЫ ДА КАНЯ».

Як паведамляе пракурор РАГАЧОЎСКАГА РАЁНА, факты ПАЦВЕРДЗІЛІСЯ і справа па абвінавачванню ЕРЫЧКОВА М. і ЛУКЯНАВА С. перадана ў суд.

ПА-ДЗЕЛАВОМУ ПРАВЯДЗЕМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА РАБСЕЛЬКОРАЎ.

ВЫХОЎВАЦЬ ПРАЎДАЙ

(З вопыту рэдактара палітаддзельскай газеты)

Калгаснік чакае ад газеты, каб **яна паказала** яму шлях жыцця, давала факты, якія выхоўваюць у ім новае светасузіранне, якое яшчэ толькі складаецца.

Ніколі яшчэ газета не мела так багата фактаў, якія даюць магчымасць « выхоўваць праўдай», як зараз. Але, на жаль, мы занадта дрэнна выкарыстоўваем гэтыя факты, і вельмі многія раённыя і паліт-аддзельскія газеты черпяць іменна ад таго, што не ўмеюць паказваць сапраўднасць, жывых людзей і іх справы так, каб пераўтвараць калгасную масу ў соцыялістычным духу.

У гэтым нарысе мы хочам падзяліцца першымі вопытамі газеты «Сталінец» (палітаддзел Сенненскай МТС) у гэтых адносінах.

* * *

Яшчэ ўчора, нават пасля таго, як стала вядома, што ён аддаў партбілет, алмовіўшыся ад пераклікі ў суседні калгас «Багданава», брыгадзір Трахім Майсеў карыстаўся ўсеагульнай павагай у калгасе «Расцвет».

Калгаснікі недаўмявалі—за што пакрыўдзілі чалавека? Хланец чэсны, не п'е, работу вядзе добра. А калі-ж не пашоў у «Багданова», як гэтага хацелі райком і палітаддзел, то хто-ж пойдзе туды, калі там прадаваць не ўмеюць і з года ў год без хлеба сядзяць?

Ведалі, што ўзамен Трахіма выклікаўся пайсці ў «Багданава» другі брыгадзір **Майсеў Паўла** і ківаді галовамі: неразумны мужык, даяней поўны дом, мал-мала-менш, а ён ідзе ў прарыўны калгас з нашага багатага калгаса.

Але гэта было учора. А сёння старшы конюх **Сідар Кабачэўскі,** учарашны абаронца Трахіма, сядзеў ля капюшні і, размахваючы свежым нумарам «Сталінца» гаварыў сабраўшымся калгаснікам:

— І які-ж ён барацьбіт за нашу праўду? Як рэволюцыі служыць? Паўна шкурнік і трус.

«Аб героях и трусах» гаварыў сёнешні нумар «Сталінца», з газетных палос узнімалася ва ўвесь рост каранастая фігура непрыкметнага героя Паўла Майсеева. Усе з дзяцінства ведалі яго. Разам гулялі яшчэ хлапчукамі, а вось тут нібы ўпершыню ўбачылі, чым быў для іх калгаса гэты скромны былы батрак. Па сутнасці, ён заўсёды ішоў уперадзе Трахіма, вось і веснавую сяўбу скончыў самым першым і потым дапамагаў другім брыгадам, але Трахім быў прадстаўніком на злётах, на канферэнцыях, умеў паказаць сябе. Два жыцці ўсталі адно супроць другога. І стала ясна, што ўсюды—на фронце грамадзянскай вайны, у перыяд барацьбы за калектывізацыю, у перыяд умацавання калгасаў—Павал быў і ёсць стойкі барацьбіт за справу рэволюцыі. Не здрадзіў ён і зараз, калі партыя прызвала яго на дапамогу адстаючаму калгасу. А Трафім? У грамадзянскай вайне ён не ўдзельнічаў. Прабыванне ў партыі скарыстаў для кар'ерысцкіх мэт, трымаўся ля каперацыі, быў загадчыкам сельпо.

Калі яго перакінулі ў калгасную вытворчасць, **дабіўся** пасылкі ў самы моцны і даходны калгас, дзе справа была наладжана і без яго. Калі-ж яго рашылі пасласць у адстаючы, ён аддаў **партбілет.**

Газета правяла паралель: чэлюскінцы і лётчыкі—непаўторныя героі. Але і Павал Майсеў таксама герой, і такіх, як ён, трэба праслаўляць у песнях і адводзіць ім газетныя палосы.

Так стаў Павел Майсеў вялікім чалавекам у раёне. Тысячы вачэй сачылі за яго работай. І з новага калгаса, дзе ён цяпер працаваў, хлынулі патокам селькораўскія пісьмы, радасна адзначаючы кожны новы яго поспех. І калі калгас паспяхова закончыў сяўбу і стаў ясны яго круты паварот да заможнага жыцця, тады газета аб'яднала усё напісанае аб ім калгаснікамі і склала «Песню пра Паўла Майсеева».

Песні аб «знатных людзях» калгасаў увайшлі ў практыку газеты «Сталінец». Іх распявалі па ўсяму раёну. Яны неслі з сабой радасць і гордасць за поспехі калгасных вытворчасці, заражалі ўсіх энтузіязмам. Прывучаемыя да паказу **ЖЫВЫХ людзей, ДА АНАЛІЗУ** спраў і паступкаў, селькоры і калгасны актыў самі заўважалі і падкрэслівалі ўсё растучае, новае і з усёй сілай і рэзкасцю абрушваліся на тое, што перашкаджала росквіту новага жыцця.

Брыгадзір **СТУК** з калгаса Хамічы добра працаваў, і газета «Сталінец» паказвала яго работу. Але вось брыгадзір адмовіўся падпісацца на пазыку — і тыя-ж калгаснікі, якія раней хвалілі яго, пішуць у газету: «Брыгадзір Стук асароміў сябе. Ён яшчэ не цвёрда стаіць на сваіх нагах і далёка яму да сапраўднага социялістычнага працаўніка. Яны самі знаходзяць патрэбныя словы «абвінавачвання». Яны паказваюць чым быў раней Стук і чым ён стаў цяпер. Цяпер у Стука ёсць усё (ідзе супастаўленне рэнейшай і цяперашняй яго маемасці). А калі ўстае пытанне аб пазыцыі, Стук хавае грошы далей ад кішэню ад совецкай улады.

Няма чаго і гаварыць, што назаўтра прысарамлены Стук падпісаўся на суму, удвая большую чым другія.

Пераменнік **Камандзір Фёдар** (у калгасе «Чырвоная гара») разлагаў калгасную дысцыпліну. Сам не ішоў на работу, хуліганіў, дэбашырыў, п'янстваваў, цягнуў за сабой частку калгаснай моладзі. Не дапамаглі ні якія ўгаворы. Некалькі раз накіроўвалі яго ў міліцыю. Пасядзіць—выпусцяць, і ён яшчэ з большым «маладзецтвам» прымаецца за сваю справу. І вось газета арганізуе пісьмо дзяўчат «Чырвонай гары». «Не хадзіце, дзеўкі, замуж за хулігана і лодыра—гавораць яны ў пісьме. Раз мы падышлі да культурнага новага жыцця, то такія—старарэжымныя — нам не падыходзяць». І, паказаўшы «майстэрства» Фёдара Камандзіра і шкоду, нанесеную ім калгасу, дзяўчаты прыходзяць да заключэння: «хоць хлопец і прыгожы, але толькі харастро яго нікуды нявартае». Увесь калгас — ад малада да вялікага — збегся на сход абгаварваць пісьмо. І, стоячы пад перакрыжаванымі позіркамі сонцень вачэй, Камандзір першы раз у жыцці страціў ухарства і бойкасць мовы: «Ну, што вы, чаго ўставіліся?», — сказаў ён, пазіраючы ў падлогу, «думаеце, прапаваць не ўмею? Аб чым гаварыць? Няхай другія цяпер за мной угоняцца».

Прайшло паўтара месяца. Камандзір заняў моцнае месца на чырвонай дошцы. У сям'і калгаса «Чырвоная гара» больш не стала лодыраў, і моладзь, ударна канчаючы сяўбу, ужо спявала ёй ва ўзнагароду для яе складзеную песню.

Наша поле—што пярына
Якасць лепшую дамо!
І з павадкамі старымі
Пойдзем у бой да перамог.
Уставай, ты, гультай,
Выпрастай спіну!
Памагай, засявай
З намі яруну і т. д.

Райком і палітаддзел узялі курс на ўмацаванне адстаючых калгасаў людзьмі. Следам за Паўлам Майсеевым дзесяткі калгаснікаў-актывістаў адгукнуліся на гэту справу і пайшлі ў «чужыя» калгасы дапамагаць ім наладжваць жыццё. Але не пашоў брыгадзір **Лазарэвіч Пётр** з калгаса «Турава». Да гэтага ён шмат гадоў у «Сталінцы», што лічыць сябе перамогшым ужо ў сваёй свядомасці рэшткі капіталістычнай псіхалогіі, бо калгаснае, агульнае яму даражэй за ўсё. І вось калгаснікі адстаючага калгаса «Канева» захацелі яго мець сваім старшынёй. Але Лазарэвіч не пайшоў. Гэта выклікала вялікае абурэнне. З другіх калгасаў ішлі ў калгас «Турава», каб «пасароміць» Лазарэвіча. А ён хаваўся ад людзей, разумеючы глыбіню гэтага ганьбавання. Дзесяткі пісем, якія клялімілі яго учынак, паступалі ў «Сталінец».

«Няхай-бы так зрабіў другі», — пісаў калгаснік **Васілёнэк,** але на яго-ж вачах загінуў Чапаеў за яго і за нас. Кім ён быў да совецкай улады? Няшчасным Пятрушкам-батраком, які і кутка свайго не меў. Кім ён стаў? Паважаным брыгадзірам Пётрам Лазарэвічам, амаль заможным калгаснікам. А цяпер ён рассеўся ў сваім доме і не хоча патурбавацца на якія-небудзь паўгода, каб дапамагчы ўстаць на ногі другім».

Так стваралася мараль. Мараль тым больш пераможная і даступная масам, што **выцякала яна не з агульных разважанняў, а з простых і зразумелых фактаў, з праўдзівага паказу жывога жыцця і жывых людзей.**

Наш друк часта вельмі мала звяртае ўвагу форме падачы матэрыяла. Штамп — грозны вораг газетнай справы — нярэдка ўбівае і робіць неўспрымальным самы жывы матэрыял. Да кожнага факта, да кожнай падзеі «Сталінец» стараўся падабраць такую форму і знайсці такія словы, каб гэта ўзяло за жывое. Зусім відавочна, што калі-б пра таго-ж Фёдара Камандзіра напісаць сухую заметку на тэму «Абуздаць хулігана», дык гэта заметка не зрабіла-б ніякага ўздзеяння ні на самога Фёдара, ні на калгаснікаў. **«Сталінец» стараўся скарыстаць усе віды зброі газетнага арсенала.** Ён **пусціў у ход зарысоўку, маленькі нарыс раешнік, пісьмо, заметку-фельетон, вершы і, нарэшце, частушку.** І трэба сказаць, што частушка заняла першае месца на сіле свайго ўздзеяння. Ледаў толькі «Сталінец» пачаў друкаваць частушкі, адразу-ж, як па сігналу, брыгадныя і калгасныя газеты (а яны былі ў пераважнай большасці калгасаў) застракацелі чатырохрадкоўямі. Мы пад'язджаем да калгаса «Латыгаль». На сценцы ў акцыляры плакат:

Уся брыгада ля дарожкі
Лынды б'е сабе штодзень
Брыгадзір у нас Шыдлоўскі
Прэмірованы за пень

Толькі напярэдадні праўленне «прэміравала» брыгадзіра рагожным спягам, а раніцой частушкі дамарошчанага паэта А. Жданава ўжо цвярдзіла цэлая вёска. Частушкі не давалі спакою лодыру. Кожны факт неахайнасці, ляноты і разтільдзяйства адразу-ж знаходзіў свой водгук у песні. Частушкі паспыталіся ў «Сталінец» як з «рога изобилия». Іх падпраўлялі і друкавалі. Старшыня калгаса «Канец» любіць доўга спаць, і селькор **Янкоўскі** зараз-жа бярэ яго на заметку:

Ён ударнік ў пратаколе
Старшыня наш Павел Ціт
Уся брыгада выйдзе ў поле
Толькі Ціт спакойна спіць.

Атраном **Спиц** не бывае ў калгасах, прападае невядома дзе, і селькор **Анабіноў** ужо кпіць з яго:

Арганом прапаў без вестак
Тыдні два няма на месцы
Баюць: цяжкі грэх здарыўся:
У ляноце ўтапіўся.

Брыгадзір **Стэльмах** не бывае ў полі, прапівае авёс, адпушчаны для коней яго брыгады і вёска выкрывае Стэльмаха ў сваёй песні:

Дзе прычына, у чым сакрэт,
Брыгадзіра знік і след?
Коні высахлі ад спёз,
Брыгадзір прапіў авёс.
(селькор Шафранскі).

Брыгадзір Стэльмах ідзе пад суд. **Песня стала сілай у руках мас. Малыя дзеці, школьнікі нападжвалі канцэрты пад вокнамі тых, аб кім гаварыла песня, не давалі праходу.** І хіба толькі адзінкі—самыя закаранелыя—маглі ўстаяць, каб не выправіць сваёй памылкі.

Вялікая бяда нашых газет—абмежаванасць тэматыкі, штучнае звужэнне сапраўднасці, звядзенне не толькі да вытворчых пытанняў. «Сталінец» стараўся пашырыць тэматыку, ставячы, хоць і далёка недастаткова пытанні аб адносінах у сям'і, аб культуры, аб быце, псіхалогіі чалавека, над якой усё яшчэ цягнецюць пережыткі мінулага. Ён ставіў сваім першым правілам не замазваць, а растлумачваць тыя супярэчнасці, што шкодзяць пераможнаму наступленню новага жыцця і стараўся на канкрэтных фактах указваць шляхі іх ліквідацыі.

У сваёй агітацыі па вытворчых пытаннях «Сталінец» імкнуўся па **найбольшай канкрэтнасці.** І, нярэдка, даказваючы выгаднасць высокаякаснай работы і ўдарнай працы, газета, як кажуць, з лічыльнікамі ў руках, падлічвала калгаснікам эфект гэтай справы. Так, напрыклад, паказваючы, як змагацца за высокі нумар валакна, газета нярэдка канчала сваю заметку матэматычнай выкладкай: «Калі калгас здасць свой план—80 цэнтн. валакна—у сярэднім восьмым нумарам, ён атрымае столькі-та хлеба і столькі-та прыпадае на працадзень. Калі дзесятым, розніца атрымаецца ўжо такая, калі дванаццатым—рэзультаты будуць такія-та і т. д. Або: «Сіроткін Аканон, ты можаш атрымаць звыш 300 пудоў зернавых». І далей ідзе выкладка, колькі членаў сям'і, колькі можа зарабіць кожны, колькі можна чакаць на працадзень і т. д. Сіроткін падлічвае і дае «сустрэчны», «Вы далі вельмі вялікую скідку на вашу ляноту»,—піша ён «я склаў у сабе план і бяруся выпрацаваць не менш 360 пудоў».

Газета «Сталінец» мае вельмі шмат недахопаў, характэрных і для другіх газет. Але мы сёння мелі мэтай паказаць тыя крупінкі станоўчага вопыту, якія да пекаторай ступені выдзялілі яе з роду другіх.

О. Арлоўская.

АД РЭДАКЦЫІ: Артыкул напісан два месяцы назад. Аднак, і зараз перадаваемы тут вопыт не страціў свайго значэння.

Першы Усесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў.

„НАШЫ СЭРЦЫ, НАШЫ СІЛЫ, НАША ВОЛЯ—З ВАМІ"

ПРЫВІТАННЕ РЭВОЛЮЦЫЙНЫМ ПІСЬМЕННІКАМ І ДРАМАТУРГАМ ЯПОНІІ І КІТАЯ.

«Першы з'езд совецкіх пісьменнікаў з гарачым хваляваннем і радасцю вітае рэволюцыйных пісьменнікаў і драматургаў Японіі і Кітая.

Весткі, якія даходзяць да нас аб вашай бясспрыкладнай стойкасці, якую не зламалі і не зломяць ніякія турмы, пагрозы і правакацыі, пакуты і расстрэлы, запальваюць нашы сэрцы бязмежнай пашанай да вас.

Мастацтва, ствараемае вамі, даходзіць не толькі да працоўных мас Японіі і Кітая, але яно, шагаючы праз граніцы, становіцца баявым веснікам нашага інтэрнацыянальнага адзінства. Нас яднае не толькі блізкасць нашага мастацтва, але і той шлях, на якім рэволюцыйныя пісьменнікі Японіі і Кітая атрымаюць канчатковую перамогу ў барацьбе за сваё вызваленне.

Нашы сэрцы, нашы сілы, наша воля—з вамі, дарагія таварыші».

АБ СТАТУЦЕ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

З ДАКЛАДА т. П. Ф. ЮДЗІНА

Спыняючыся на пытанні членства ў саюзе совецкіх пісьменнікаў, тав. Юдзін азнаёміў з'езд з папярэднімі вынікамі прыёму ў члены і кандыдаты ССП па СССР. Ён паведаміў, што ўсяго ў саюз совецкіх пісьменнікаў прынята каля 2.500 чал., з іх 1.600 у члены і астатнія ў кандыдаты. Асноўная колькасць прынятых у ССП—1.535 чал.—падае на РСФСР; па УССР прынята 206 чал., па БССР—каля 100, у Грузіі—58, у Арменіі—90, у Азербайджане—79, у Туркменіі—14 і т. д. Тав. Юдзін падкрэсліў, што прыём у ССП паказаў значны рост пісьменніцкіх кадраў у напрэспубліках і аўтаномных нацабласцях.

Гаворачы аб дапаўненні статута новым пунктам аб кандыдатах у члены ССП, тав. Юдзін адзначае, што ідэя кандыдацтва сустрэла вялікае падтрымание сярод моладзі.

У заключнай частцы свайго выступлення т. Юдзін гаворыць аб тым, што глебай, на якой вырасла совецкая літаратура, з'яўляюцца совецкі лад і новыя социялістычныя вытворчыя адносіны. Метад социялістычнага рэалізма стаў асноўным метадам творчасці совецкіх пісьменнікаў. Правільнае яго прымяненне патрабуе ад пісьменнікаў пільнага вывучэння рэчаіснасці і актыўнага ўдзелу ў социялістычным будаўніцтве.

ДАКЛАД МАНДАТНАЙ КАМІСІІ

Ад імя мандатнай камісіі з'езда з кароткім дакладам выступае тав. **Вішнеўскі.** На з'ездзе, — дакладвае он,—прысутнічае 376 дэлегатаў з рашаючым голасам і 215 з дарадным. 60,4 проц. дэлегатаў з'езда—комуністы і комсамольцы. Аплайдысментамі сустракае з'езд агаласнэнне спіса нацыянальнасцей, прад стаўнікі якіх прысутнічаюць на з'ездзе. 69,9 проц. дэлегатаў—рабочыя і сяляне.

Каля двух трэціх дэлегатаў з'езда —літаратурны маладняк.

Дзеннік з'езда совецкіх пісьменнікаў

На вячэрнім пасяджэнні 31 жніўня прадаўжаліся спрэчкі па дакладах тт. **Стаўскага** і **Гарбунова** аб рабоце з пачынаючымі пісьменнікамі.

У спрэчках выступілі тт. **Огнеў, Пур'е, Браўн, Багдэнаў, Гусеў, Дазаян, Іобах, М. Галодны.**

З'езд віталі т. **Кубрыкаў** ад пачынаючых калгасных аўтараў, якіх аднае «Крестьянская газета» і т. **Болы** ад імя дэлегацыі совецкіх кампазітараў. З'езд таксама віталі аб'яднаная дэлегацыя рабочых спосумяшчальнікаў **аўтазавода імя Сталіна і «Трохгорной мануфактуры».**

З'езд заслухаў паведамленне тав. **Юдзіна** аб статуце Саюза совецкіх пісьменнікаў і даклад тав. **Вішнеўскага** аб мандатнай камісіі з'езда.

З'езд аднадушна ўхваліў паслаць прывітанні рэволюцыйным пісьменнікам Кітая і Японіі.

Конкурс советаў

СУР'ЁЗНЫ ЎРОК

С Гэтымі днямі прэзідыум ЦВК БССР на сваім пасяджэнні заслухаў даклад сакратара лельчыцкага РВК **Клімовіча** і судакладчыка інструктара аргінструктарскага аддзела ЦВК аб ходзе конкурса-спаборніцтва советаў па раёну.

Прэзідыум ЦВК канстатаваў, што лельчыцкі РВК у справе разгортвання конкурса праявіў поўную бадзейнасць. З боку прэзідыума РВК і раённай конкурснай камісіі адсутнічае аператыўнае кіраўніцтва і практычная дапамога советам.

Сам конкурс не ўзвязваецца з выкананнем палітычна - гаспадарчых кампаній. У рэзультаце на 20 жніўня гадавы план хлебапаставак выкананы толькі на 39,5 проц. Жывёлагадоўчыя фермы ўкамплектаваны ўсяго на 70 проц. План дорбудаўніцтва выкананы на 60 проц.

Да гэтага часу яшчэ не закончан рамонт 11 школ. Соцспаборніцтва і дарніцтва паміж советамі зусім не разгорнута. Секцыі і дэпутацкія групы арганізаваны фармальна і ні адна з іх не працуе.

Улічыўшы ўсё гэта, прэзідыум ЦВК БССР абвясціў суровую вымову старшыні РВК т. **Гаўрусёву** і вымову сакратару РВК — старшыні раённай конкурснай камісіі т. **Клімовічу** за яўнае ігнараванне конкурса советаў, за адсутнасць усякай работы па мабілізацыі шырокіх працоўных мас, актыва, секцый, дэпутацкіх груп вакол конкурса.

Разам з гэтым прэзідыум ЦВК прапарадзіў т. **Гаўрусёву,** што калі ў бліжэйшы час не будзе зроблена рашучы пералом у разгортванні конкурса советаў і выкананні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній у раёне і ўпершую чаргу на хлебапастаўках, да яго будуць прыняты больш суровыя меры спагнання.

Апрача таго прэзідыум ЦВК прапанаваў лельчыцкаму РВК, пад адказнасць т. Гаўрусёва, і раённай конкурснай камісіі, пад адказнасць т. Клімовіча, неадкладна прыняць захады да поўнага выканання ўмоў канкурса.

Р.

НА ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў МЕНСКУ, ПРЫСВЕЧАНАЙ МІЖНАРОДНАМУ ЮНАЦКАМУ ДНЮ.



Каманда значкістаў ГСА швэйнай фабрыкі імя Крупскай

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

31 жніўня гэтага года пры наведанні японскім паслом г. Ота намесніка народнага камісара па замежных справах Б. С. Стаманякава апошні заявіў яму, што, паводле атрыманых у НКЗС вестак, 22 жніўня японскай жандармерыяй у Харбіне была арыштавана канторшчыца матэрыяльнай службы КУЧ т. Галавіна і знявольена ў памяшканні жандармерыі на Паштовай вуліцы. Праз некаторы час яна была выклікана для допыту ў другое памяшканне, дзе да яе пры допыце былі прыменены наступныя бесчалавечныя катаванні: паміж пальцамі рук ёй былі паложаны металічныя брускі, прычым пальцы звязваліся вяроўкай, якую моцна зацягвалі, так, што Галавіна траціла прытомнасць. Далей, на допытах т. Галавінай збівалі кулакамі твар і галаву, вырывалі валасы і лілі ваду ў рот і нос. Усе гэтыя катаванні рабіліся японскімі служачымі.

27 жніўня т. Галавіну ў вельмі цяжкім стане вывелі на вуліцу і без усякай дапамогі адправілі дамоў з першым спатканым звозчыкам, папярэдзіўшы яе, што пасля папраўлення здароўя яна будзе зноў арыштавана. У сучасны момант т. Галавіна, з прычыны яе цяжкага становішча, змешчана пры садзейнасці генконсульства СССР у Харбіне ў больніцу.

Тав. Стаманякаў заявіў, што гэта фактычнае паведамленне, зробленае самой Галавіной прадстаўніку совецкага генконсульства ў Харбіне, пацвярджае горшыя паведамленні прэсы аб бесчалавечных катаваннях, якім падвяргаюцца арыштаваныя служачыя КУЧ з мэтай вымусіць у іх «прызнанні», быццам яны самі арганізоўвалі тыя шматлікія напады на ўсходняй лініі КУЧ, ад якіх перш за ўсё страдалі і страдаюць самі служачыя і іх сем'і.

Па даручэнню совецкага ўрэда т. Стаманякаў заявіў г. Ота пратэст супроць усіх гэтых дзеянняў японскіх улад у Манчжурыі і ўказаў, што совецкі ўрад чакае ад японскага ўрада прыняцця рашучых мер да спынення ўсіх указаных недапушчальных дзеянняў, якія наносяць да таго-ж такую відавочную шкоду адносінам паміж абодвумі дзяржавамі.

(БЕЛТА).

АДКРЫЛАСЯ ПРАМАЯ ТЭЛЕФОННАЯ СУВЯЗЬ ПАМІЖ МАСКВОЙ І ПАРЫЖАМ

МАСКВА, 1 верасня. (БЕЛТА). 31 жніўня адкрылася прамая тэлефонная сувязь паміж Масквой і Парыжам. Тэхнічныя работы па ўстанаўленню тэлефоннай сувязі Масква-Парыж вяліся на працягу жніўня. Тэлефонная лінія, якая звязвае абедзве сталіцы, праходзіць па тэрыторыі СССР, Польшчы, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Швейцарыі, Францыі.

Паражэнне нанкінскіх войск у барацьбе з кітайскай Чырвонай арміяй

ТОКІО, 1 верасня. (БЕЛТА). Шанхайскі карэспандэнт японскага агенцтва «Сімбун рэнго» паведамляе, што цзянсійская кітайская Чырвоная армія, пачаўшая наступленне ў паўднёва - ўсходняй частцы правінцыі Хунань, разбіўшы нанкінскія войскі пад камандаваннем Хо Цзяна, заняла Жучэн (у паўднёва-ўсходнім куце правінцыі Хунань) і прасоўваецца ў напрамку Гуйяна і Сіньцяна з намерам злучыцца з Чырвонай арміяй Хэ-Луна, адначасова пачаўшай наступленне ў паўднёва-заходняй частцы правінцыі Хунань.

Цзянсійская кітайская Чырвоная армія — указвае далей карэспандэнт японскага агенцтва—наступае трыма групамі: першая група ў складзе 10 тысяч пад камандаваннем Пен Дэ-хуая наступае з Чуні (у заходняй частцы правінцыі Цзянсі), другая ў колькасці 10 тыс. пад камандаваннем Юан Фын-міна наступае ў тым-жа напрамку і трэцяя група ў складзе 10 тысяч ужо заняла паўднёва-ўсходнюю частку правінцыі Хунань.

У той-жа час Чырвоная армія пад камандаваннем Хо-Луна ў паўднёва-заходняй частцы правінцыі Хунань падыйшла да Чандэ (буйны пункт у паўночнай частцы правінцыі Хунань). Нанкінскія войскі — паведамляе карэспандэнт — спешна ўмацоўваюць свае пазіцыі ўзроўж ракі Сян. У сувязі з паражэннем нанкінскіх войск у паўднёва-ўсходняй частцы правінцыі Хунань Хо-цзян рэарганізуе нанкінскія часці.

У той-жа час Чан Кай-шы, прыняўшы асабіста камандаванне авіяцыйнымі сіламі нанкінскага ўрада ў раёне Хунань, загадаў пачаць авіяцыйную бамбардыроўку пазіцый кітайскай Чырвонай арміі. Чан Кай-шы 27 жніўня меў нараду ў Куліне з Чжан Сюэ-лянам аб становішчы ў правінцыі Хунань.

Карэспандэнт «Сімбун рэнго» указвае, што ў Чанша прыбывае велізарная колькасць раненых. У кіруючых колах Чанша — піша карэспандэнт — у сувязі з наступленнем кітайскай Чырвонай арміі панує паніка.

Паведамляючы аб наступленні кітайскай Чырвонай арміі ў правінцыі Хунань, шанхайскі карэспандэнт агенцтва «Дэмпо цусін» указвае, што 30-тысячнай Чырвонай арміяй камандуе Пен- Дэ-хуай.

Крушэнне поезда на паўднёвай лініі КУЧ

ТОКІО, 31 жніўня. (БЕЛТА). «Сімбун рэнго» паведамляе з Харбіна, што ноччу 30 жніўня поезд, які ішоў з Харбіна ў Чаньчунь, пацярпеў крушэнне на паўднёвай лініі КУЧ. Паравоз і 4 вагоны сышлі з рэек. Зараз-жа пасля крушэння атрад бандытаў колькасцю ў 100 чалавек падверг поезд абстрэлу з вінтовак і кулямётаў. Паміж японскай аховай поезда, перапоўненага японскімі пасажырамі, і напаўшым атрадам завязаўся бой, які прадаўжаў ся на працягу двух гадзін. Паводле папярэдніх даных, у часе бою забіты чатыры японцы, 24 ранены, у тым ліку 9 знаходзяцца ў цяжкім становішчы. Паводле паведамлення карэспандэнта «Дэмпо цусін», забіта 10 японцаў; апрача таго, бандытамі ўведзена 9 японскіх пасажыраў.

Згодна слоў «Сімбун рэнго» на месца крушэння з Харбіна выслан бронепоезд і дапаможны поезд.

Фашызм ненавісны германскім рабочым

ПАРЫЖ, 31 жніўня. (БЕЛТА). Сярод падпаўшых арышту ў Берліне членаў міжнароднай дэлегацыі антыфашысцкай моладзі, сядзіўшых у Германію даведацца аб становішчы Тэльмана, знаходзіліся два французы — комсамолец **Бертэло** і член французскай юнацкай арганізацыі **«Лаік рэпюблікен» Пьер Пэн.** Зараз яны вярнуліся ў Парыж і зрабілі наступныя заявы прадстаўнікам друку.

Пьер Пэн заявіў, што будучы ў Германіі, ён пераканаўся 1) у страшнай галечы рабочых у Берліне, 2) у глыбокай нянавісці рабочых да нацыянал - социялісцкага рэжыму, 3) у росце руху супроць фашызма, які захапляе большую частку нацыянал-социялісцкіх штурмавых атрадаў.

Да гэтага Пэн дадаў, што паводле заслугоўваючых давер'я вестак германскія ўлады фальсіфікавалі рэзультаты плебісцыта ў Берліне. У некаторых бюро былі пастаўлены даве урны: у адну ўкідваліся станоўчыя, а ў другую адмоўныя бюлетэні, з тым, каб выявіць галасаваўшых супроць Гітлера. Тры нацыянал-социялісты, адкрыта галасаваўшыя супроць Гітлера, зніклі на другі дзень. Папярэдадні плебісцыта былі праведзены шматлікія правентыўныя арышты.

Паводле заявы **Бертэло,** берлінскія комсамольцы распаўсюджвалі лістоўкі аб прыбыцці міжнароднай юнацкай дэлегацыі ў Германію. Бертэло паведаміў, што ўсюды ў Берліне адчуваецца работа комуністычнай арганізацыі.

СКАЖЭННІ СОВЕЦКАГА ГАНДЛЮ У ВІЦЕБСКІМ ЦРК

У сваім выступленні на Ўсебеларускай гандлёва-тэхнічнай канферэнцыі старшыня віцебскага ЦРК тав. **ВЕРБА** вельмі красамоўна гаварыў аб прынцыпах Совецкага гандлю, аб лепшым задавальненні спажыўца, прыводзіў лічбы вялікіх дасягненняў віцебскага ЦРК.

За гэтымі прыгожымі фразамі хаваюцца яўнае ашуканства і самыя злачынныя скажэнні асноў совецкага гандлю.

Каб паказаць тыя недапушчальныя метады гандлю, якія прымяняе віцебскі ЦРК, прывядзем рад прыкладаў. Яны ярка характарызуюць гандлярска-наймаўскі цушок, які пануе ў гандлёвай дзейнасці ЦРК.

Загадчык гандлёвага аддзела **ШЛАПАКОЎ** закупляе ў крэменчугскім трэсце грамадзкага харчавання сушаныя бычкі ў колькасці звыш 17 тыс. кгр. па раздробнай цане 2 р. 70 кап. **ЦРК у сваю чаргу робіць накідку на раздробную цану і прадае іх спажыўцу па 3 р. 10 кап. за кгр.**

Той-жа ШЛАПАКОЎ закупляе ў «Кіеўгандлі» — раздробнай дзяржаўнай арганізацыі — каля 17 тыс. кгр. цукру-пяску па камерцыйнай цане 13 руб. кгр. Яму дадецца скідка 12 кап. з кгр. І тут зноў ЦРК робіць накідку ў суме 2014 руб. ШЛАПАКОЎ спакойна атрымаў камісыйныя. Яму не было ніякай справы да таго, што ў Віцебску ўжо знаходзілася каля двух вагонаў цукру. ЦРК прымушан быў каля паловы купленага тавару перапрадаць гуртам рэчыцкаму райсаюзу са скідкай. У рэзультаце гэтай аперацыі ЦРК затварыўся цукрам і пацярпеў страты.

Той-жа ШЛАПАКОЎ закупляе ў раздробнай гандлёвай арганізацыі — «Кіеўгандлі» звыш 2 тыс. кгр. фісташкаў па цане 23 р. 60 кап. кгр. Зразумела, што віцебскі рынак не мог пераварыць такой вялікай колькасці фісташак, ды яшчэ па высокай цане. ЦРК перапродае фісташкі іншым арганізацыям — Магілёўскаму ЦРК, Менскай базе Белкаапсаюза з вялікай скідкай. Гэта аперацыя нанесла каля 4 тыс. руб. страт; 40 тыс. руб. на працягу двух-трох месяцаў замарожаны ў яўна няходкім тавары.

Больш таго. Старшыня праўлення віцебскага ЦРК ВЕРБА, для таго, каб пазбавіцца няходкага тавара, былому намесніку дырэктара Менскай базы Белкаапсаюза **АЕРМАНУ,** за тое, што апошні згадзіўся рэалізаваць фісташкі праз сваю пізавую сетку, пераводзіць на хатняму адрасу «узнагароду» ў 500 руб.

Закупшчык АЙБІНДЭР набыў у Днепрапетроўску каля чатырох тон сухіх фруктаў. Яны аказаліся нядобраякаснымі, рэалізаваліся больш паўгода і дагэтуль поўнасцю не праданы.

А чаго варты такі факт, як набыццё за 23 дні трох вагонаў мандарынак? Купляць такую вялікую колькасць фруктаў не было ніякай патрэбы. Можна і трэба было закупіць не больш аднаго вагона.

Адначасовая закупка трох вагонаў коштам у 200 тыс. руб. прывяла да замарожвання вялікіх зваротных сродкаў, да псавання прадукцыі і нанесла значныя страты. Каб пазбавіцца мандарынак, ЦРК перапрадаў адзін вагон гуртам Белгандлю і страціў па гэтым каля 10 тыс. руб.

Яшчэ адзін факт, які ілюструе злачынныя скажэнні совецкага гандлю. Закупшчык **БЕЙЛІНСОН** закупляе партыю гатовай вопраткі на 97 тыс. руб. Уся партыя — з грубашэрснага матэрыяла, трэннай афарбоўкі, зусім неадпавядаючага асартыменту. Недзіўна, што ЦРК затаварыўся гэтай вопраткай і дагэтуль ніяк не можа рэалізаваць яе. Той-жа БЕЙЛИНСОН закупае ў раздробнай арганізацыі — Окцяўбрскім спажывецкім таварыстве (Масква) — гатовую вопратку на 30 тыс. руб. са скідкай з раздробнай цаны на 3 проц., прычым гэта скідка не пакрывае нават расходаў па адпраўцы і ўпакоўцы. Гэта вопратка — зімовыя светлыя паліто малочнага колеру з рагожнага матарыяла. Хіба каму гэта патрэбна?

У апошніх запісах бухгалтарыі фігуруюць частыя закупкі малафактуры, трыкатажу, абутку, галантарэі ў «Мосторге», «Белгандлі», «Дынамо» і іншых раздробных гандлёвых арганізацыях.

Зразумела, за гэтыя пакупкі расплачваецца спажывец, за кошт якога выязджае Віцебскі ЦРК.

Усе гэтыя факты сведчаць аб страце праўленнем віцебскага ЦРК класавай лініі ў совецкім гандлі, аб прытупленні рэволюцыйнай пільнасці парткома і рэвізійнай камісіі віцебскага ЦРК (сакратар парткома, ён-жа старшыня рэвізійнай камісіі т. Гасілоўскі).

Пракуратуры Рэспублікі патрэбна зараз-жа заняцца гэтай справай, вызваліць каапэрацыйны апарат ад спекуляцыйна-наймаўскіх элементаў, ад перараджэнцаў, здольна скажаючых асновы совецкага гандлю.

С. БУТОМАЎ, Н. ЮМУК.

***

Ажыццяўляючы пастанову ЦК ВКП(б) аб барацьбе з абважваннем, ашуканнем спажыўца і парушэннямі совецкай палітыкі цэн, мы, рабочая брыгада віцебскага фанернага завода, абследвалі краму і сталоўку завода, падпарадкаваныя віцебскаму ЦРК.

Мы высветлілі, што гіры і вагі кляймілися яшчэ ў 1929 годзе, што старшыня праўлення ЦРК тав. **Верба** груба парушае совецкую палітыку цэн. Так, 10 жніўня ЦРК накіраваў у нашу краму 3000 кгр. бульбы для ўдарнікаў нашага завода па фактуры № 1398 па цане 25 кап. У гэты-ж дзень у «Віцебскім пролетарыі» гарснаб апублікаваў цэны на гародніну, бульбу і іншыя прадукты. Прычым, у аб'яве ўказвалася, што цана бульбы 18 капеек кілограм.

Далей мы высветлілі, што партком і фабком забаранілі продаж бульбы па 25 кап. Фабком і партком спрачаліся з ЦРК аднесна продажу бульбы на сапраўдную цане — 18 кап. кілограм. Але пакуль спрачаліся, тая. Верба паў загад прадаваць бульбу па 25 капеек кілограм і заяўку загадчыку крамы Рабкіну: «Не ваша справа, я загадваю прадаваць па 25 капеек, і кропка». На гэтай аснове загадчык крамы і прадаваў бульбу па 25 кап., кажучы: «Начальства так загадала, дык я так і буду рабіць».

Мы просім рэдакцыю газеты «Звязда» прыняць меры да злосных парушальнікаў совецкай палітыкі цэн, бо рабочыя, ударнікі нашага завода абураны гэтым агіднейшым фактам.

Брыгада МЯСАЕДАЎ РОХЛІН, РАЯК, ІЛЬІН.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

ПАСТАНОВА

Народнага Камісарыята Асветы БССР

29 жніўня 1934 г. г. Менск.

Не гледзячы на неадпаравовыя ўказанні РАЙАНА аб спыненні водпуску настаўнікаў з раёна і перакідкі іх у другія раёны, некаторыя нат. райаны яшчэ да гэтага часу прадаўжаюць адкамандыраванне настаўнікаў за межы раёна, а потым тэлеграфна патрабуюць дасылкі нехапаючых настаўнікаў (Гомльскі райана адпусціў 12 чал., патрабуе 15, гомельскі райана адпусціў многай яўр. школы і патрабуе замены).

Лічу такое становішча недапушчальным і таму ЗАГАДВАЮ:

1. Спыніць водпуск настаўнікаў з раёна без уважлівых прычын.
2. Загадчыку гомельскага райано за масавую адкамандыроўку настаўнікаў і патрабаванне на іх месца новых стаўлю на від.
3. Загадчыку гомельскага гарана ўказваю на недапушчальнасць скарачэння кадраў яўр. школ, чым зрываецца нармальная праца гэтых школ, а асабліва гомельскай школы імя Леніна.
4. Для абследвання становішча гомельскай яўр. школы імя Леніна згодна заявы дырэктара тав. АРВАНА, прысначаю камісію ў складзе тт. ТАКАРСКАГА, ГАРОДКІНАЎ і прадстаўніка ЦК саюза.

Камісіі закончыць работу к 5-IX—34 г. і ўвесь матэрыял прадставіць мне.

Нарком Асветы БССР ЧАРНУШЭВІЧ.

Гарком саюза працаветы паведамляе, што з 1-IX па 8-IX г. г. у памяшканні ГК саюза будзе праводзіцца ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ КВАТЭРНЫХ КАРТАК НА АТРЫМАННЕ ПАЛІВА членаў саюза працаветы. Усіх культаветных устаноў г. Менска — калектыўна.

Мята — размеркаванне талонаў на дровы.

Гарком саюза працаветы.

Звуком, адміністрацыя, калектыў (рабочых і служачых Усцянскага вінзавода з вялікім жалем паведамляе аб смерці старога большавіка-дырэктара Усцянскага вінзавода

Леона Станіслававіча ФРАНКЕВІЧА,

паследваўшай у Менску 31 жніўня.

Усцянскі вінзавод.

Беларускае аддзяленне Усесаюзнага таварыства старых большавікоў паведамляе аб смерці старога рэволюцыянера, большавіка - падпольшчыка.

т. ФРАНКЕВІЧА Леона Станіслававіча.

Вынас цела адбудзецца 2 верасня ў 6 г. вечара з клуба старых большавікоў (вул. К. Маркса і Энгельса).

Кіраўніцтва спраў СНК і Эканомсавета БССР, партыйная арганізацыя і масцком з глыбокім жалем паведамляюць аб смерці работніка СНК БССР

т. Баранкоўскага В. Н.

пасля доўгай хваробы 30 жніўня г. г. і выказваюць спачуванне сям'і памёршага.

ДЗЯРЖЦЫРК

Закрыццё сезона 2, 3, 4, 5, і 6 верасня

АПОШНІЯ ПРАДСТАЎЛЕННІ

ЗАКРЫЦЦ ЦЫРКА.

Пачатак у 9 гадз. вечара. Каса адкрыта з 12 да 3 і 6 да 11 г. веч.

6-г верасня ў 2 гадз. дня АПОШНІ РАНІШНІК ЗАКРЫЦЦЁ СЕЗОНА.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)

Мост. кір. засл. арт. рэсп. Л. М. Литвінаў

2 верасня 1934 г. Пачатак сезона 1934-35 г.

К. Крапіва

КАНЕЦ ДРУЖБЫ

драма ў 4 дзеях.

Прэмірована на конкурсе БССР

Заяўкі на мэтавыя спектаклі прымаюцца ў тэатры і ў раб. касе.

2-3 верасня 1934 г. на віцебскай швэйнай фабрыцы «СЯЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» склікаецца КАНФЕРЭНЦЫЯ НА РАЗГЛЯДУ І ЗАЦВЯРДЖЭННЮ ФАСОНАЎ, МАДЭЛЕЙ НА МУЖЧЫНСКІЯ ЗІМОВЫЯ І ДЭМІСЕЗОННЫЯ ШВЭЙНЫЯ ВЫРАБЫ з удзелам прадстаўнікоў буйнейшых прадпрыемстваў г. Віцебска, калгаснікаў, работнікаў прылаўка і тавара-праводзячай сеткі.

Просьба да ўсіх арганізацый, пасылаючых сваіх дэлегатаў на канферэнцыю зблізнечыць іх яўку дакладна к часу, адзначанаму ў мандаце.

ОРГКАМІСІЯ.

Кіно «Пятрасцацігадовага» Новая совецкая камедыя АДНЫ ЗНАЁМЫЯ

Кіно «СПАРТАК» Выдатны рэстаўраны фільм КНЯЖНА МЭРЫ Кіно-роман у 8 частках.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ПРОЛЕТАРЫЙ" Совецкая, 87, тэл. 22-150.

СЁННЯ, 2 ВЕРАСНЯ, І ШТОДЗЁННА

Амерыканскі гукавы мастацкі фільм

ЗДРАДНІЦТВА МАРВІНА БЛЕЙКА

У галоўнай ролі Рычард Бартэльмес.

У праграме гукавая кіно-хроніка

СОВЕЦКАЕ ЗАПАЛЯР'Е.

У файэ КАНЦЭРТ муз-джаза пад кіраўніцтвам М. М. Штэймана

ЗУСІМ НОВЫ РЭПЕРТУАР.

Пачатак сеансаў у 6, 7-30, 9 і 11 г. Каса адкрыта з 12 г. дня.

Кінс-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Новы гукавы мастацкі фільм вытворчасці Украінфільм Ад 1 верасня

ХРУСТАЛЬНЫ ПАЛАЦ

У праграме гукавая хроніка.

Штодзённа 4 сеансы.

ПАЧАТАК у 6, 7-30, 9-15 і 11 гадзін.

КАСА ад 1 гадз. дня.

На летняй эстрадзе: канцэртнае аддзяленне: Р. Г. Чарына, С. А. Угельскі (скетчы, фельетоны, сэтыры), Нікіфераў і Рамірава (эпэрэтачны дуэт)

БЕЛЗАГОТЖЫВЁЛА

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎСІХ ЖЫВЁЛАЗДАТЧЫКАЎ

(калгаснікаў і аднаасобнікаў), што за жывёлу, здаваемую па абавязацельствах,

аплачваюць прыёмныя пункты ЗАГОТЖЫВЁЛЫ

наяўнымі грашыма ў момант прыёмкі.

Жывёлаздатчыкі, якія па якіх-небудзь прычынах не атрымалі плацяжоў у момант здачы жывёлы як у бягучым, так і ў мінулым гадах, павінны паклапаціцца атрымаць плацяжы, якія прылі,ваюцца ім, да 15 верасня гэтага года.

Аплата неатрыманых плацяжоў за жывёлу робіцца ўсімі райканторамі райзаготжывёлы па прадстаўленню абавязацельства аб здачы жывёлы.

БЕЛЗАГОТЖЫВЁЛА.

Менская кантора Заготзярно і БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКА паведамляюць, што ў сувязі з сканчэннем хлебапаставак па Менскаму пункту калгасы, соўгасы, каапгасы, якія не атрымалі пералічэння або якім няправільна занесены пералічэнні, павінны да 3 верасня звярнуцца ў Дзяржбанк да т. Міхайлава або ў Заготзярно да тав. Садоўснага.

Заготзярно—ХЕЙФЕЦ. Дзяржбанк—МАРКАЎ.

Чэрыкаўскі дзяржаўны ветэрынарны тэхнікум паведамляе, што набор у тэхнікум працягнут да 20 верасня. Іспыты з 25-IX. Усе ўмовы апрача тэрміна навучання, які ўстаноўлен у тры гады, ранейшыя (гл. «Звязду» № 171 ад 4-VIII 1934 г.).

ДРУКАРНІ „ЗВЯЗДЫ"

ПАТРЭБНЫ ВУЧНІ-ЛІНАТЫПІСТЫ І ПАДЧЫТЧЫКІ.

Зварачацца да дырэктара—па адрасу Совецкая, 63, другі паверх

БЕЛТА патрабуюцца пакой і кватэра (1-2 пакоі) з удобствамі.

Плата па згодзе.

Можна за паўгода ўперад.

Зварачацца: Совецкая, 57, Белта тэл. 20-626.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ

у садова-гародны інстытут на факультэты: плодагародны і інжынерна-тэхналагічны працягнут да 25-IX 34 г.

Іспыты з 25-IX-34 г. па 30-IX-34 г.

Пачатак заняткаў з 1-X—34 г.

Адрас інстытута: Менск, Лошыца 1-я.

Дырэктар Інстытута ЛАГУЦЕНКА.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — Р. ДОДЗІН, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер — Е. КАГАН, ст. друкар — З. РУБІН.